МАГУТНАЯ СІЛА, АД ЯКОЙ ЗАЛЕЖЫЦЬ ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

Дарагія юнакі і дзяўчаты!
Сардэчна віншую вас з Днём моладзі.

Маладосць — гэта цудоўная пара, калі кожны чалавек выбірае сваю дарогу. Перад вамі шырокія перспектывы — ад асваення новых ведаў да прымянення сваіх сіл у навуцы, эканоміцы, культуры, грамадскім жыцці. Вашы смелыя ідэі, жаданне працаваць і ствараць заўсёды запатрабаваны на роднай зямлі.

Беларусь ганарыцца маладым пакаленнем — разумным і таленавітым, прыгожым і мэтанакіраваным. Вы магутная сіла, ад якой залежыць заўтрашні дзень краіны. Менавіта вам давядзецца ўзяць на сябе адказнасць за развіццё дзяржавы і будаваць яе будучыню.

Любіце сваю краіну, працуйце, дзейнічайце дзеля яе дабрабыту і працвітання.

Няхай вам заўсёды спадарожнічае любоў і разуменне блізкіх, а ваша жыццё будзе напоўнена святлом ведаў і радасцю творчасці.

Няхай здзейсняцца вашы надзеі і мары!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СУБОТА № 120 (27730) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СІМВАЛІЧНЫЯ ПРЫПЫНКІ

У Мінску з'явяцца прыпыначныя пункты «Музей Вялікай Айчыннай вайны» і «Плошча Дзяржаўнага сцяга», паведамілі на прадпрыемстве «Сталічны транспарт і сувязь».

З 1 ліпеня для аўтобусных маршрутаў №№ 29, 44, 136,163 прыпыначныя пункты «Праспект Пераможцаў», размешчаныя па праспекце Пераможцаў і праспекце Машэрава, пераймяноўваюцца ў «Музей Вялікай Айчыннай вайны». Для аўтобусных маршрутаў №№ 1, 29, 44, 69, 77, 91, 136 і тралейбуснага маршрута № 39 прыпыначны пункт «Выставачны комплекс» пераймяноўваецца ў «Плошча Дзяржаўнага сцяга».

Фота БЕЛТА.

■ Курсавая розніца

РУБЕЛЬ ЗНІЖАЕЦЦА

Але не выходзіць за межы чаканняў

Вынікі тыдня на айчынным валютным рынку карэспандэнту «Звязды» пракаментаваў аналітык кампаніі ТэлеТрэйд-Беларусь Міхаіл ГРАЧОЎ.

На яго думку, зніжэнне курсу беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША (вырас на 20 рублёў да 10200) і еўра (выраслa на 30 рублёў да 13890) абумоўлена, як і раней, палітыкай плаўнай дэвальвацыі. «Пры гэтым паступовае зніжэнне курсу нацыянальнай валюты аказвае падтрымку экспартным галінам эканомікі, што, у сваю чаргу, спрыяе павелічэнню бюджэту краіны. Праўда, гэта негатыўна адбіваецца на зберажэннях грамадзян у беларускай валюце. Але дзякуючы высокай працэнтнай стаўцы рэфінансавання і высокім працэнтам па дэпазітах у беларускіх рублях даходнасць па ўкладах застаецца дадатнай», — гаворыць аналітык.

СТАР. 2

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена выпускніцы БДСГА Наталлі САЛДАЦЕНКА.

У ДОБРЫ ШЛЯХ У ЛЮБІМАЙ КРАІНЕ!

Учора ў сталіцы адбыўся рэспубліканскі выпускны баль, на які былі запрошаны 200 лепшых выпускнікоў ВНУ з усіх рэгіёнаў краіны. На свяце, па добрай традыцыі, прысутнічаў Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БЕЛТА.

Даючы наказ маладым людзям у сапраўднае дарослае жыццё, кіраўнік дзяржавы заклікаў іх звязваць сваю будучыню з Беларуссю, а не шукаць прывіднага шчасця за яе межамі. «Бо па-сапраўднаму можна быць шчаслівым толькі на Радзіме, у коле сваіх сяброў і блізкіх. Яшчэ знакаміты філосаф Вальтэр казаў, што людзі нярэдка сыходзяць далёка шукаць тое, што маюць у сябе дома», — сказаў Прэзідэнт.

«У заўтрашні дзень вы можаце глядзець упэўнена і смела. Суверэнная і незалежная Беларусь — дзяржава маладая і адкрывае велізарны прастор для прыкладання вашых сіл і здольнасцяў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да выпускнікоў.

«Стаўце перад сабой амбіцыйныя мэты і старайцеся дасягаць іх. Але не будзьце пасіўнымі і, самае галоўнае, не палохайцеся жыццёвых цяжкасцяў. Смела, мэтанакіравана ідзіце наперад. Тады прыйдзе да вас і поспех у справах, і прызнанне калег», — даў наказ Прэзідэнт. «Галоўнае цяпер — старанне і праца, вернасць выбранаму шляху, назапашванне прафесійнага майстэрства. Пакажыце на практыцы, чаму вас навучылі студэнцкія гады. І памятайце: добры пачатак працоўнай біяграфіі — гэта шлях да поспеху ў кар'еры ды і ва ўсім жыцці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр МІКЛАШЭВІЧ:

«Уплыў глабалізацыі, новых выклікаў сучаснасці абумоўлівае неабходнасць пастаянна, глыбока асэнсоўваючы працэсы, якія адбываюцца, павышаць эфектыўнасць канстытуцыйнага кантролю з мэтай абароны годнасці, правоў і свабод чалавека. Важна пры гэтым, улічваючы сусветныя і еўрапейскія стандарты ў галіне правоў чалавека, захоўваць канстытуцыйную ідэнтычнасць, забяспечваць далейшае канстытуцыйнае развіццё нашых краін з улікам гістарычна выпрацаваных народамі нацыянальных традыцый і каштоўнасцяў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2014 г.

Долар ЗША	10200,00	▲
Еўра	13890,00	■
Рас. руб.	303,50	▲
Укр. грыўня	862,58	▲

ВАЕННАЕ РЭХА КРУПСКАЙ ЗЯМЛІ

У гады акупацыі на тэрыторыі толькі аднаго раёна дзейнічалі 6 тысяч партызанаў

Крупскі раён быў вызвалены літаральна за некалькі дзён да таго запаветнага дня, калі ў беларускую сталіцу ўвайшлі чырвонаармейцы. Баі за крупскую зямлю працягваліся пяць дзён. Шмат жыццяў было пакладзена на алтар Перамогі, дашчэнту былі разбураны многія будынкі, ледзь не на папялішчы стаяў і так зруйнаваны гарадскі пасёлак.

30 чэрвеня 1944 года ў ходзе Віцебска-Аршанскай наступальнай аперацыі, дзякуючы баявому майстэрству вайскоўцаў 3-й і 18-й танкавых брыгад, 2-й мотастралковай брыгады 3-га гвардзейскага танкавага корпуса 5-й гвардзейскай танкавай арміі 3-га Беларускага фронту, раён быў цалкам вызвалены. Пачалося мірнае жыццё. У летапісе крупскай зямлі была перагорнута старонка, ён стаў сведчыць гісторыю новага часу, без болю і пакут...

Клаўдзія Мартынаўна БАРЫСАВА.

ПАД АКУПАЦЫЯЙ

Усведамленне страшнай рэальнасці, што пачалася вайна, у Крупкі прыйшло 1 ліпеня 1941 года. Гітлераўцы ў лічаныя дні завалодалі цэлым раёнам, расправы над мірным насельніцтвам пачалі вяршыць амаль адразу.

Каля гестапа была створана турма, другая знаходзілася пры камендатуры. У двух кіламетрах ад горада быў арганізаваны канцлагер, на тэрыторыі якога размяшчаўся вагон-душагубка. За гады вайны тут было знішчана больш за дзве тысячы чалавек.

— У Крупках працавала школа па падрыхтоўцы агентаў гестапа, — расказвае **навуковы супрацоўнік Крупскага гісторыка-краязнаўчага музея Таццяна ПАПАЎЯН.** — За злоўленага партызана абяцалі ўзнагароджанне — 13 пудоў солі, а за тых, хто звязаны з народнымі мсціўцамі, — 5. На тэрыторыі раёна немцы стварылі некалькі гарнізонаў. Звычайна ў іх налічвалася па 100 чалавек. Але былі і буйныя гарнізоны: у Крупках, напрыклад, дыслацыраваўся 400 гітлераўцаў.

У першыя месяцы акупацыі гітлераўцы, як і ўсюды, праводзілі масавае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва. У верасні 1941 года каля вёскі Лебедзева было забіта 1975 жыхароў Крупак, а ў Бабры — 961 чалавек, пад Халопенічамі — 2700 крупчан. Працаздольнае насельніцтва вывозілася ў Германію, астатнія людзі выкарыстоўваліся на работах у Крупках.

Мясцовыя жыхары ішлі ў партызанскія атрады. Першым партызанскім атрадам у раёне стала група акружэнцаў пад камандаваннем Сяргея Жуніна. Так быў створаны атрад Сяргея. Пазней узніклі групы Кулікова, Мажэйкі, Гурскага і іншыя.

— У маі 1942 года ў раён на парашутах закінулі дыверсійную групу Алены Колесавай, — працягвае супрацоўніца музея. — За кароткі час 12 дзяўчат узарвалі чыгуначны мост, 4 варожыя эшалоны, 7 эшалонаў разам з іншымі дыверсійнымі групамі, 3 аўтамашыны, удзельнічалі ў пагроме шасці гарнізонаў. 11 верасня 1942 года падчас аднаго з пагромаў Алена Колесава загінула. Пасмяротна ёй прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Сёння імя гэтай мужнай дзяўчыны носіць піянерская дружына Крупскай раённай гімназіі.

Толькі партызаны за тры гады акупацыі здзейснілі ў раёне 159 дыверсій. Вялікія страты панёс вораг, асабліва на чыгунцы. Рэйкавая вайна набірала абароты. І вялікая заслуга ў гэтым ураджэнца Крупскага раёна Аляксея Лукашэвіча. Пра яго подзвіг, які адзначаны Зоркай Героя, ведаюць усе крупчане — ад малога да вялікага. Трапіўшы ў засаду ў лістападзе 1943-га, быўшы цяжка параненым, ён узарваў сябе і немцаў гранатай.

СТАР. 3

■ Па сутнасці справы

СЕЗОННЫ ЗАРОБАК,

або Пачым смакоцце ў народа?

Заўзятыя дачнікі ды ягаднікі штогод з нецярпеннем чакаюць новага ўраджаю. Кажуць, у добры сезон на шчодрых дарах зямлі можна зарабіць неблагія грошы. Але, вядома, год ад года адрозніваецца, бо надвор'ю, якое непасрэдна ўплывае на колькасць і якасць вырашчанага, закон не пісаны. У нашай смачнай падборцы вы даведаецеся сёлетнія прагнозы на ўраджай, а таксама атрымаеце падказку, як не прагадаць і найбольш выгадна прыстроіць свой сезонны тавар. Аматараў жа паласавацца, каб зарыентавацца ў цэнах, запрашаем разам з карэспандэнтам «Звязды» прагуляцца па сталічным стыхійным рынку.

КАМЕРЦЫЙНАЯ ТАЙНА ЗБОРШЧЫКАЎ ЧАРНІЦ

Ураджай небагаты, канкурэнцыя значная, але нарыхтоўка ідзе

Усе нарыхтоўшчыкі ў адзін голас адзначаюць сёлетні невялікі ўраджай чарніц. З чым гэта звязана, сказаць цяжка. Паводле слоў Таісы КУІС, дырэктара Івацэвіцкага каапнарыхтоўпрама, у папярэднія гады на нарыхтоўчыя пункты здавалі да пяці тон ягад за дзень, а цяпер добра, калі прынясуць 400-500 кілаграмаў.

СТАР. 4

Галоўная зборшчыца чарніц у сям'і Кабрынцоў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБАМА ЗАПРАСІЎ 500 МІЛЬЁНАЎ ДЛЯ СІРЫЙСКАЙ АПАЗІЦЫІ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама запрасіў 500 мільёнаў долараў для навучання сірыйскай апазіцыі. На думку газеты The New York Times, рашэнне Абамы, які паслядоўна супраціўляўся ідэі ваеннай дапамогі сірыйскім паўстанцам і папярэджваў аб небяспецы амерыканскай інтэрвенцыі ў гэтую краіну, адлюстроўвае занепакоенасць з-за таго, што сірыйскі канфлікт захліснуўся ў Іраку. Як вядома, апошнія некалькі тыдняў у Іраку актывізаваліся суніцкія баевікі — іх узначальвае групоўка «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта».

У Белым доме абвясцілі, што мільённыя сродкі дапамогуць абараніць сірыйскі народ і стабілізаваць сітуацыю ў раёнах, якія кантралююцца апазіцыяй. У той жа час пакуль незразумела, па якіх праграмах будуць узбройваць і навучаць сірыйскую апазіцыю, а таксама як менавіта будуць правяраць добранадзейнасць паўстанцаў.

У ДАНЕЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗНОЎ ПАДАРВАЛІ ЧЫГУНКУ

Раніцай 27 чэрвеня на станцыі Агародны адбыліся два выбухі на чыгуначным мосце. Рух цягнікоў быў часова спынены. У выніку часткова пашкоджана апора, пралётная будова моста, 10 шпал і 12 метраў пуці. Праводзяцца аварыйна-аднаўленчыя работы.

Узрывы пуцей Данецкай чыгункі сталі адбывацца ледзь не штодзень. 22 чэрвеня невядомыя асобы ўчынілі два падрывы чыгуначных пуцей ва ўсходняй частцы Украіны: на ўчастку Ілавайск—Куцейнікава і на перагоне Ілавайск — Моспіна. 24 чэрвеня адбылося несанкцыянаванае ўмяшанне ў работу чыгункі на перагонах Горлаўка — Панцеляймонаўка і Горлаўка — Новабахмутаўка, Караванная — Доля, Булавін — Дэбальцава. 25 чэрвеня адбыліся выбухі на трох участках чыгуначных пуцей у горадзе Горлаўка.

«ГАЗПРАМ» МОЖА ПАКАРАЦЬ ЕС

Кампанія «Газпрам» рыхтуе меры ў адказ для краін, якія ўдзельнічаюць у рэверсе газу з Еўропы ва Украіну. Цяпер прадстаўнікі газавага гіганта кажуць аб магчымым змяншэнні паставак паліва. Украіна 25 чэрвеня прапанавала ЕС запусціць «вялікі рэверс» газу аб'ёмам да 30 мільярдаў кубаметраў штогод праз тэрыторыю Славакіі і разлічвае пачаць рэверсныя закупкі газу ўжо з 1 верасня гэтага года.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЫЕТА З САДАВІНЫ І АГАРОДНІНЫ НЕ ЎРАТУЕ АД ЛІШНІХ КІЛАГРАМАЎ

Супрацоўнікі Універсітэта Алабамы (ЗША) высветлілі: актыўнае спажыванне садавіны і агародніны не дапаможа пахудзець, насуперак распаўсюджанаму меркаванню. Напрыклад, у ЗША рэкамендуюць штодня з'ядаць па 1,5—2 кубкі садавіны і 2—3 агародніны. Аднак нярэдка людзям, якія сядзяць на дыеце, раяць уключаць яшчэ больш садавіны і агародніны ў рацыён. Яны нібыта могуць выцесніць шкодныя прадукты з дыеты. Але такая схема не працуе, паказала даследаванне.

Навукоўцы параўналі міжземнаморскую дыету з дыетай, якая мае мінімальную колькасць тлушчу за кошт багацця агародніны і садавіны. Высветлілася, што міжземнаморская дыета, якая прадугледжвае ўжыванне аліўкавага алею, працавала лепш. Таксама вядома, што сардэчнікі, якія прытрымліваліся міжземнаморскай дыеты, на 30% радзей перажывалі сардэчны прыступ, чым людзі, якія сядзелі на дыеце з нізкай колькасцю тлушчу. З гэтага навукоўцы зрабілі выснову: сёння амаль усе асноўную ўвагу надаюць агародніне і садавіне, забываючы пра іншыя важныя элементы ў рацыёне.

■ Выбарчая акруга

ЛЮБОЎ І КЛОПАТ ВІКТАРА ЛІСКОВІЧА

Яго аднолькава добра ведаюць як урача, былога кіраўніка і дэпутата

Гродна Віктар Андрэевіч упершыню ўбачыў 17-гадовым маладым чалавекам. Тым летам ён прыехаў паступаць у медыцынскі інстытут. Пасля кожнага іспыту садзіўся ў тралейбус і катаўся па ўсіх існуючых маршрутах. Па старых вуліцах хадзіў пешшу, глядзеў, запамінаў, удыхаў водар горада і, як многія, хто аказаўся тут хаця б аднойчы, Гродна палюбіў. Яму пашанцавала ў гэтым горадзе не толькі вучыцца і жыць, але і працаваць, а таксама кіраваць цэлай галіной.

СТАР. 2

Віктар Лісковіч не проста часты госць Гродзенскага абласнога спецыялізаванага дома дзіцяці, але і ўдзельнік свят, і памочнік у пошуку спонсараў.

ISSN 1990 - 763X

У ДОБРЫ ШЛЯХ У ЛЮБІМАЙ КРАІНЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Дзяржава, са свайго боку, імкнецца стварыць спрыяльныя ўмовы для станаўлення маладых спецыялістаў, павышэння іх кваліфікацыі і кар'ернага росту. Таму актыўна далучайцеся да мадэрнізацыі эканомікі, распрацоўкі і ўкаранення найноўшых тэхналогій, рэалізацыі перспектыўных сацыяльных і культурных пытанняў», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка напярэдадні вялікага свята — 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — таксама заклікаў памятаць і берагчы вялікія заваёвы мінулых пакаленняў, падкрэсліўшы гераічную гісторыю беларускага народа. «Дамагайцеся поспеху і памятайце, што нашым агульным здабыткам з'яўляецца моцная і квітнеючая краіна. І толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам пабудаваць шчаслівую будучыню для нашай роднай Беларусі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Словы падзякі Прэзідэнт адрасаваў рэктарам ВНУ і выкладчыкам за годныя вучняў, у выхаванне якіх укладзена велізарная педагагічная праца.

Ва ўрачыстай абстаноўцы Аляксандр Лукашэнка ўручыў 10 лепшым выпускнікам ВНУ спецыяльныя лісты аб аб'яўленні падзякі Прэзідэнта за выдатныя поспехі ў вучобе, прыкладныя паводзіны і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

■ Крылаты флот

Новыя «Боінгі» будуць лятаць па турыстычных напрамках

«Белавія» падпісала кантракт на пастаўку трох самалётаў адразу з завода

Учора нацыянальная авіякампанія і Boeing падпісалі пагадненне аб куплі трох самалётаў Boeing 737-800 Next-Generation. Гэта першая прамая купля такіх самалётаў «Белавія». Замова ацэньваецца ў 272 млн доларaў.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ВЫРАБ

«Гэта значная падзея для кампаніі і для пасажыраў, — лічыць **Анатоль ГУСАРАЎ, генеральны дырэктар авіякампаніі «Белавія».** — Пасля доўгіх і складаных перамоў мы падышлі да этапу падпісання кантракта з карпарацыяй Boeing на закупку

трох сучасных камфартабельных суднаў. Мы ўпэўнены, што самалёты, якія будуць спецыяльна для нас пабудаваны, спадабаюцца нашым пасажырам».

Тэрмін пастаўкі, прадугледжаны кантрактам, — 2017 год. «Патрэбныя нам самалёты — самыя папулярныя сёння. Таму нам давядзецца пачакаць даволі працяглы час, пакуль яны будуць гатовы, — удакладніў кіраўнік нацыянальнай авіякампаніі. — Тым больш што судны індывідуальныя. Мы, зразумела, просім, наколькі магчыма, скараціць тэрміны пастаўкі, але ўся вытворчасць распісана».

Дарэчы, новенькія «Боінгі» плануюць выкарыстоўваць для чартарных рэйсаў у папулярных турыстычных напрамках — Турцыя, Балгарыя, Грэцыя і іншыя краіны. «Гэта істотна знізіць кошт перавозак для жыхароў Беларусі. У першую чаргу за кошт таго, што самалёты вельмі эфектыўныя з пункту гледжання спажывання паліва. І гэта дае магчымасць ажыццяўляць перавозкі з меншымі выдаткамі. А значыць, пры меншым кошце білетаў для пасажыраў эканоміка кожнага рэйса будзе ўсё роўна ў плюсе». Судны будуць абсталяваны салонамі эканамічнага класа, разлічанымі на 189 пасажыраў.

«Аднак да пастаўкі новых самалётаў мы плануем выкарыстоўваць ТУ-154. Яны адпавядаюць усім сусветным патрабаванням па бяспецы. Сёння мы на іх выконваем толькі чартарныя рэйсы ў Грэцыю, Балгарыю і ў іншых напрамках», — паведаміў Анатоль Гусараў.

ЗАМЕЖНЫ КРЭДЫТ І РАМОНТНЫ ХАБ?

Сума кантракта з Boeing перавышае 270 млн доларaў. Грошы вялікія. Для таго, каб іх выплаціць, «Белавія» давядзецца выкарыстоўваць, акрамя сваіх рэсурсаў, крэдыты. Хто падставіць кампаніі фінансавае плячо, пакуль невядома. «Зразумела, што крэдытныя рэсурсы будуць задзейнічаны. На плацяжы, якія павінны ажыццявіць сёлета, мы маем грошы. Па астатняй суме будзем працаваць з банкамі, у тым ліку з Банкам развіцця і замежнымі банкамі. Час на пошук крыніц фінансавання яшчэ ёсць», — заявіў кіраўнік авіякампаніі.

У той жа час ідуць перамовы аб стварэнні ў Беларусі буйнога транспартнага вузла (так званага хаба) па рамонце і абслугоўванні самалётаў. Кампанія Boeing разглядае магчымасць яго стварэння. Пра гэта паведаміў старшы віцэ-прэзідэнт па міжнародных продажах грамадзянскіх самалётаў кампаніі Марцін Бентрот. «Мы будзем працаваць над гэтым з партнёрам авіякампаніяй «Белавія», — сказаў ён. Генеральны дырэктар «Белавія» ўдакладніў, што гэтае пытанне абмяркоўвалася днямі ў беларускім урадзе. Цяпер Boeing і «Белавія» будуць рыхтаваць прапановы па гэтай тэме.

Нагадаем, што Boeing з'яўляецца вядучай сусветнай авіякасмічнай карпарацыяй і найбуйнейшым вытворцам пасажырскіх самалётаў. А «Белавія» — найбуйнейшы авіяперавозчык Беларусі, у тым ліку вядучы грузавы, у парку паветраных судоў якога 26 самалётаў (з іх 15 Boeing).

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

ЛЮБОЎ І КЛОПАТ ВІКТАРА ЛІСКОВІЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З яго іменем звязваюць адкрыццё абласнога перынатальнага цэнтра — аднаго з лепшых у Беларусі. Цяпер Віктар Лісковіч прадстаўляе Гродзенскую-Паўночную выбарчую акругу ў парламенце. Медыкі Гродзеншчыны па старой памяці лічаць, што ён абараняе ва ўладзе іх інтарэсы, і, як толькі ён пераступае парог медыцынскай установы, кажуць пра неабходнасць замены абсталявання і пошук грошай. У гэтым жа плане на яго разлічвае і мясцовая выканаўчая ўлада. Насамрэч дэпутату прыходзіцца значна пашыраць межы сваёй папярэдняй кампетэнцыі. Наколькі гэта ўдаецца парламентарыю Лісковічу — мы паспрабавалі высветліць на месцы, у культурнай сталіцы Беларусі 2014 года.

АСАБЛІВАСЦЬ АКРУГІ

Гродзенская-Паўночная акруга № 51 — гэта, па сутнасці, Ленінскі раён — адна з дзвюх адміністрацыйных адзінак горада. Тут размешчана меншая частка буйных прадпрыемстваў горада, затое большая частка ўстаноў адукацыі і аховы здароўя. Кіраўнік адміністрацыі раёна Іван Курман расказвае, на якую падтрымку свайго прадстаўніка ў сталіцы разлічвае горад:

— У гарвыканкаме няма структурнага падраздзялення, якое канкрэтна б курыравала ахову здароўя горада, таму мы разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў спрабуем праз Міністэрства аховы здароўя вырашыць пытанні ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы нашых гарадскіх медыцынскіх устаноў — у прыватнасці, тых, якія знаходзяцца на тэрыторыі Ленінскага раёна. Перш за ўсё, размова ідзе пра паліклінікі, каб павысіць узровень прафілактычнай і амбулаторнай дапамогі нашаму насельніцтву.

У сваю чаргу, Віктар Лісковіч адзначае даступнасць выканаўчай улады і хуткае вырашэнне многіх пытанняў выбаршчыкаў. «У маіх сустрэчах з гродзенцамі ёсць асаблівасць: мы не накопліваем звароты, імкнёмся вырашаць праблемы адразу і да асабістага прыёму многія пытанні здымаем», — расказвае ён.

Вялікую дапамогу ў гэтым дэпутату аказвае памочнік Руслан Стракалаў, юрыст па адукацыі і супрацоўнік службы «Адно акно» Ленінскага райвыканкама Гродна.

— Да нас прыйшла шматдзетная маці адразу з трыма праблемамі, — прыводзіць ён прыклад звароту да дэпутата. — Першая — паляпшэнне жыллёвых умоў. Мы выйшлі на будаўнічую арганізацыю з просьбай забраніраваць за гэтай сям'ёй кватэру ў доме, які будуецца, каб бацькі паспелі адкрыць ільготны крэдыт. Другая праблема — адсутнасць пешаходнага пераходу на чыгуначным пераездзе. Для яе вырашэння неабходна ўчастак чыгункі перадаць на баланс горада, і гэтую працэдуру таксама ўдалося запусціць. Нарэшце, трэцяе пытанне датычылася прызнання непрыдатным для пражывання жылога памяшкання, якое замацавана за адным з прыёмных дзяцей...

На пытанне: «Якія заканадаўчыя ініцыятывы нараджае работа ў акрузе?» — Віктар Лісковіч разам з памочнікам адразу згадваюць дзве. Ад супрацоўнікаў абласнога МНС паступіла прапанова аб унясенні папраўкі ў дзеючае заканадаўства аднос-

Віктар Лісковіч (злева) з задавальненнем завітвае ў Гродзенскі абласны перынатальны цэнтр, які ўзначальваў 9 гадоў. Яго суправаджаюць галоўны ўрач Уладзімір Звярко і намеснік галоўнага ўрача Святлана Дамбоўская.

УНІВЕРСІТЭЦКІЯ КЛІНІКІ

Гэтыя прапановы — не адзіныя. Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Віктар Сняжыцкі паведаміў пра адсутнасць у Кодэксе аб адукацыі асаблівага згадвання сістэмы медыцынскай адукацыі. Нічога няма ў дзеючым заканадаўстве ні пра інтэрнатуру — першасную паслядыпломную спецыялізацыю выпускнікоў, ні пра клінічную ардынатуру — адну з найвышэйшых форм прафесійнай перападрыхтоўкі ўрачоў-спецыялістаў.

— Яшчэ адно крайне важнае пытанне датычыцца бакалаўрыяту. На захадзе ў Балонскім працэсе медыцынскія вышэйшыя навучальныя ўстановы не ўдзельнічаюць, але ў новай рэдакцыі нашага Кодэкса аб адукацыі медыцынскія ВНУ з сістэмы «бакалаўр — магістр» не выключаны. Аднак урача з дыпломам бакалаўра пасля 4 гадоў навучання на працу ніхто не возьме: — медыцынскай вышэйшай адукацыі бакалаўрыят не патрэбны, — тлумачыць кіраўнік Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта.

Акрамя таго, Савет універсітэта прапануе ініцыяваць абмеркаванне ў парламенце пытання аб арганізацыі ўніверсітэцкіх клінік, якія, упэўнены выкладчыкі, крайне патрэбны для практычнай аховы здароўя, але асабліва — для медыцынскай адукацыі.

— Мы гатовы стаць першымі ў Беларусі, — заяўляе Віктар Сняжыцкі. — Гэтае пытанне неаднаразова ўздымалася ва ўрадзе. Пра яго казаў і віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік. Але на заканадаўчым узроўні яно пакуль не абмяркоўвалася.

ПАМІЖУЛАДНЫ МОСТ

Фарміраваць ідэі для заканатворцаў і вырашаць многія мясцовыя праблемы на Гродзеншчыне дапамагаюць унікальныя «круглыя сталы». Пасяджэнні адбываюцца адзін раз у квартал у рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда». Асаблівасць іх у тым, што за адным сталом для пошуку рашэнняў збіраюцца прадстаўнікі выканаўчай, заканадаўчай улады і журналісты.

— Ідэя такіх сустрэч узнікла тады, калі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі 5-га склікання ад Гродзеншчыны сталі звяртацца ў газету па публікацыі сваіх справаздач, — згадвае намеснік галоўнага рэдактара газеты Лілія Навіцкая. — Тады мы вырашылі, што газета можа паслужыць добрым мостам паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі.

На адным пасяджэнні «круглага стала» дэпутаты паставілі пытанне рамонту магістралі М6 «Мінск — Гродна», дзе ўжо распачаты работы па рэканструкцыі. У выніку іншага была распрацавана сістэма ўзаемадзеяння структур дзяржаўнай аўтаінспекцыі, аховы здароўя і ваенкаматаў дзеля ўзмацнення адказнасці кіроўцаў пры праходжанні медыцынскага агляду. Гэты вопыт аказаўся цікавым, для ўсёй Беларусі.

Пра свой вопыт зносін з дэпутатам з ахвотай расказаў і першы сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Аляксандр Коўш:

— Мы заўсёды з Віктарам Андрэевічам «звяраем часы»: падчас яго працы ў акрузе сустракаемся, ён удзельнічае ва ўсіх нашых мерапрыемствах. Гэта дае свае вынікі. У маі Віктар Андрэевіч быў абраны ў склад абласнога камітэта. Для нас вельмі каштоўны асабісты вопыт парламентарыя ў дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Удзельнікам абласнога этапу конкурсу «Уладар сяла» Віктар Андрэевіч расказваў пра заканадаўчыя навелы ў сферы сям'і, моладзі і аграрнай палітыцы.

ДА ПЕРШАГА ЎЗДЫХУ

Па-сапраўднаму як дома Віктар Лісковіч, напэўна, адчувае сябе ў сценах абласнога перынатальнага цэнтра, які пад яго кіраўніцтвам не толькі набыў свой статус, імя, але і стаў першым па самых галоўных паказчыках для такой установы — колькасці паспяховага выходжвання дзяцей, здароўі мацярок, утульнай атмасферы і ўкараненні перадавых тэхналогій.

— У 2012 годзе мы завяршылі маштабную рэканструкцыю цэнтра, напоўнілі яго сучасным абсталяваннем, аднымі з першых забяспечылі поўную інфарматызацыю і першымі сярод установ аховы здароўя ўкаранілі сістэму менеджменту якасці ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, — з гонарам кажа Віктар Лісковіч. — Усё гэта дазволіла нам наладзіць сістэмны падыход да кожнага выпадку родаў, што вельмі важна ў планаванні работы медыцынскай установы і дасягненні поспехаў.

У аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі нованароджаных Гродзенскага перынатальнага цэнтра выходжваюць неданошаных дзяцей з масай менш за 1 кілаграм. Самыя маленькія немаўляткі, якіх выпісалі з гэтага аддзялення здаровымі, пры нараджэнні важылі ўсяго толькі 470 грамаў.

— Яшчэ ў радзільнай зале, да першага ўздыху неданошаным дзецям уводзяць прэпараты, якія дапамагаюць раскрыццю лёгкіх, — расказвае загадчык аддзялення Аляксандр Козіч. — Прадугледжана ўсё: транспарціроўка ў спецыяльным кювезе ў аддзяленне рэанімацыі, выбар правільных параметраў штучнай вентыляцыі лёгкіх, кантроль руху крыві і яе саставу, неадкладная карэкцыя любых адхіленняў.

Па ініцыятыве Віктара Лісковіча ў перынатальным цэнтры быў адкрыты (падобных у свеце не існуе) Музей развіцця акушэрства, дзе, акрамя цікавых экспанатаў і ўнікальнай інфармацыі захоўваецца памяць пра людзей, якія ўнеслі ў сферу акушэрства Гродзеншчыны значны ўклад.

За амаль 70 гадоў існавання Гродзенскага абласнога перынатальнага цэнтра ў яго сценах нарадзілася больш за 350 тысяч чалавек — прыкладна столькі, колькі цяпер пражывае ў Гродне. Дарэчы, сам Віктар Андрэевіч прыняў каля 6 тысяч немаўлят.

Але яго клопат пра дзяцей сценамі радзільнага дома не абмяжоўваўся раней, не абмяжоўваецца і цяпер. Дэпутат парламента — часты госць Гродзенскага абласнога дома дзіцяці, і, як правіла, — не з пустымі рукамі.

— Віктар Андрэевіч нам вельмі дапамагае, — расказвае галоўны ўрач Дома дзіцяці Алег Страбкоў. — Па-першае, ён знаходзіць спонсараў. За 5 месяцаў гэтага года мы ад прыватных асоб атрымалі памперсаў, цацак, мяккага інвентару, санітарна-гігіенічных сродкаў і іншых карысных рэчаў на 78 млн рублёў. Яшчэ амаль 40 млн паступілі на наш разліковы рахунак ад прыватных асоб і арганізацый. Па-другое, Віктар Андрэевіч заўсёды знойдзе добрае слова ў адрас нашых супрацоўніц. Ды і з малымі ён хораша ладзіць.

Дом дзіцяці — не адзіны адрас дабрачыннай дапамогі, па якую дэпутат Лісковіч рэгулярна звяртаецца да гродзенскай бізнес-суполкі. За апошні год яму ўдалося прыцягнуць спонсарскіх грошай на суму больш за 150 млн рублёў. На іх былі куплены абсталяванне і цацкі для шматдзетных сям'яў, цэнтра рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў, дзіцячых садкоў. Напэўна, нельга адмовіць чалавеку, які прыняў у гэты свет 6 тысяч дзяцей і шмат зрабіў для здароўя дзясяткаў тысяч іншых. Асабліва калі ён просіць не для сябе. І калі яму даверылі абараняць інтарэсы гэтых дзяцей і іх бацькоў у вышэйшым заканадаўчым органе краіны.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Канфлікты

У ІРАКУ ЗНОЎ НЕСПАКОЙНА

За апошні месяц у Іраку, па інфармацыі ААН, загінула звыш тысячы чалавек, і пераважна гэта — мірнае насельніцтва. Суніцкія паўстанцы з групоўкі «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта» ўстанавілі кантроль над значнай тэрыторыяй краіны, у тым ліку захапілі і буйнейшы ў краіне нафтаперапрацоўчы комплекс у горадзе Байджы, што знаходзіцца за 200 кіламетраў ад Багдада, сталіцы Ірака.

Дзмітрый МІРОНЧЫК, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў, пракаментаваў карэспандэнту «Звязды» падзеі ў Іраку:

— Мы занепакоены эскалацыяй канфлікту і асуджаем дзейнасць тэрарыстычных груповак і акты насілля, якія пацягнулі за сабой шматлікія ахвяры. Сотні тысяч жыхароў гэтай краіны былі вымушаны стаць уцекачамі. Беларусь спадзяецца, што сітуацыя ў Іраку як мага хутчэй стабілізуецца: тэрытарыяльная цэласнасць гэтай краіны будзе захавана, а міжканфесійныя рознагалоссі — урэгуляваны. Хацеў бы таксама звярнуць увагу на тое, што МЗС на працягу ўсіх апошніх гадоў настойліва раіць грамадзянам Беларусі ўстрымацца ад наведвання Рэспублікі Ірак.

Арганізацыя «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта» была створана ў 2006 годзе пры ўдзеле «Аль-Каіды», прычым спачатку групоўка насіла назву «Ісламская дзяржава Ірака». Шыіты, прадстаўнікі другога кірунку ў ісламе, аб'яўлены адным з галоўных ворагаў «Ісламскай дзяржавы». Для барацьбы з імі суніцкія паўстанцы арганізуюць тэрарыстычныя акты, якія забіраюць жыцці соцень тысяч людзей, знішчаюць культавыя будынкі.

Наша краіна падтрымлівае сяброўскія стасункі з Рэспублікай Ірак у палітычнай і эканамічнай сферах. Так, гэтая дзяржава зацікаўлена ў прыцягненні беларускіх спецыялістаў для працы ў будаўнічай галіне — узвядзенні жыллёвых комплексаў, а таксама заводаў па вытворчасці будматэрыялаў, аналагічных беларускім. Развіваецца супрацоўніцтва з Іракам і ў галіне адукацыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Факт

ПРА ПЕНСІІ І ДАПАМОГІ

На прыёме грамадзян у Іванаве, які правяла міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА, асноўныя пытанні датычыліся налічэння пенсій.

Усе, хто звярнуўся да міністра, атрымалі падрабязнае тлумачэнне парадку налічэння пенсій у кожным асобна ўзятым выпадку.

Адзін з жыхароў раёна, які ў дзяцінстве быў прымусова вывезены ў Германію, не атрымлівае належных выплат, бо не мае патрэбных дакументаў, якія пацвярджалі б знаходжанне яго на тэрыторыі Германіі. Яму Марыяна Акіндзінаўна параіла яшчэ раз звярнуцца ў службу міжнароднага пошуку з запытам. А яшчэ папрасіла кіраўніцтва раёна аказаць былому малалетняму вязню матэрыяльную дапамогу да Дня Незалежнасці краіны.

Пасля прыёму грамадзян міністр працы і сацыяльнай абароны наведала Іванаўскі тэрытарыяльны цэнтр абслугоўвання насельніцтва і азнаёмілася з яго работай па рэабілітацыі інвалідаў, дапамозе састарэлым адзінокім пенсіянерам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗДАЎ ЭКЗАМЕН? ТАДЫ ПАЛЮЙ

Загадам Міністэрства лясной гаспадаркі зацверджаны пытанні экзаменацыйных тэстаў для атрымання дзяржаўнага пасведчання на права палявання.

Кандыдат у паляўнічыя павінен адказаць на дзесяць пытанняў білета. Час абмежаваны 30 хвілінамі. Для кожнага пытання прапануецца некалькі варыянтаў адказаў. Правільным можа быць як адзін, так і некалькі варыянтаў. Вынік вызначаецца па працэнце правільных адказаў. «Прахаднымі», як паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса, лічацца 80 працэнтаў.

Быць гатовым да тэстаў дапамогуць ва УП «Белдзяржпаляванне». Для кандыдатаў на атрыманне дзяржаўнага пасведчання на права палявання там працуюць вячэрнія курсы па падрыхтоўцы да здачы спецыяльнага паляўнічага экзамену. «Наведваць» іх можна і дыстанцыйна — праз інтэрнэт. На спецыяльным партале можна не толькі знайсці патрэбную літаратуру, але і паспрабаваць свае сілы ў пробных тэстах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВУЧЫЦЦА І СЛУЖЫЦЬ НА «ВЫДАТНА»

На плошчы Дзяржаўнага сцяга яблыку не было дзе ўпасці. Сотні сяброў, сваякоў экс-студэнтаў наведалі ўрачысты выпуск Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў.

Дыплом і доўгачаканыя лейтэнанцкія пагоны на вачах у блізкіх атрымалі больш за 400 выпускнікоў акадэміі. Цікава, што з адзнакай вышэйшую навучальную ўстанову скончылі 52 маладыя афіцэры. 6 з іх за выдатную вучобу атрымалі залатыя медалі.

У сваю чаргу, **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў,** зазначыў, што практычна ўсе праваахоўныя органы жадаюць атрымаць квоту, навучаць сваіх супрацоўнікаў у гэтай ВНУ. «Гэта сведчыць пра высокі ўзровень выкладання, добрыя традыцыі, закладзеныя ў акадэміі. Наперадзе ў выпускнікоў вялікая і светлая будучыня, праца ў добрых умовах. Іх служба прынясе карысць Беларусі».

Якуб ЖУРБІН.

СТАРЫМ ДАРОГАМ — 490

Старым Дарогам 28 чэрвеня спаўняецца 490 гадоў. У святочных мерапрыемствах прымуць удзел дэлегацыі гарадоў-пабраціма: Лухвіцы (Расія) і Барадзянка (Украіна).

— Святкаванне пачнецца з радыёканцэрта на Цэнтральнай плошчы горада, — паведаміла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы Старадарожскага райвыканкама Святлана КАРАЛЬКО.** — У праграме і тэатралізаванае прадстаўленне, якое нагадае гістарычныя вехі развіцця мястэчка Дарогі. У тым ліку кіраванне князёў Алелькавічаў і Радзівілаў, падзеі грамадзянскай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны. Пасля адбудзецца парад-конкурс дзіцячых калясак, шэсце працоўных калектываў да мемарыяла загінулых воінаў і партызанаў, ускладанне кветак, а таксама марш вайскоўцаў.

Падчас свята ветэранам Вялікай Айчыннай вайны ўручаць юбілейны медаль «70 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», а Ганаровым грамадзянам Старадарожчыны — пасведчанні. Ушануюць і знакамітых людзей раёна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПЕСНІ Ў ПАДТРЫМКУ

У сталічным Маладзёжным тэатры эстрады адбыўся дабрачынны канцэрт «Галоўнае на свеце — гэта нашы дзеці». Сродкі ад яго правядзення будуць накіраваны на будаўніцтва новага будынка Беларускага дзіцячага хоспіса.

«Гэта толькі невялікая частка і наш унёсак у падтрымку дабрачыннага марафону па зборы сродкаў, які быў абвешчаны раней на тэлевізійных і радыёканалах Белтэлерадыёкампаніі», — адзначыла **Наталля МАРЫНАВА, кіраўнік тэлеканала «Беларусь 2»,** які робіць тэлеверсію канцэрта. У эфір яна выйдзе 28 чэрвеня. Удзел у запісе ўзялі папулярныя беларускія артысты і калектывы, сярод якіх Пётр Ялфімаў, Вольга Вронская, Ганна Благава, Тэа, Іскуі Абалян, ансамбль «Верасы», тэатр эстраднай песні «Хвілінка»; атмасферу дабрыні і цеплыні падтрымалі вядомыя тэлеперсоны. Арганізатарамі ж дабрачыннага вечара выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Белтэлерадыёкампанія, Мінгарвыканкам і Маладзёжны тэатр эстрады.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

РУБЕЛЬ ЗНІЖАЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вельмі рэзкім на гэтым тыдні аказаўся рост курсу расійскага рубля адносна беларускага (на 7,5 рубля да 303,5). На гэта паўплывала некалькі фактараў: «Па-першае, умацаванне расійскай валюты ў адносінах да бівалютнага кошыку на міжбанкаўскім рынку Расіі. Гэта адбывалася на працягу апошніх двух тыдняў на фоне некаторай стабілізацыі ўкраінскага крызісу і росту кошту нафты на сусветных рынках з-за абвастрэння сітуацыі ў Іраку. У сераду кіраўнік Цэнтрабанка Расіі паведаміла аб павелічэнні дзяржаўных рэзерваў да 471 млрд рублёў. На мінулым тыдні Дзяржаўнай думай афіцыйна быў зацверджаны прафіцыт бюджэту за першы квартал гэтага года ў памеры 1,3% ВУП. Усё гэта, безумоўна, паслужыла ўмацаванню эканомікі і, адпаведна, расійскага рубля».

У найбліжэйшы час курс нацыянальнай валюты не зведае рэзкіх змен. Працягнецца плаўная дэвальвацыя ва ўстаноўленых Нацбанкам параметрах. «Сёння дэвальвацыя складае 6,7%, або 12-13% у гадавым вылічэнні, што ўкладваецца ў прагнозныя рамкі. У межах гэтых параметраў чаканы курс беларускага рубля да канца года можа знізіцца да 11000 за долар ЗША. Падтрымку палітыкі Нацбанка аказваюць павялічаныя экспартныя паступленні і крэдыты з боку Расійскай Федэрацыі і ў рамках ЕўрАзЭС. Так, учора быў падпісаны крэдытны дагавор паміж расійскім ВТБ-Банкам і ўрадам Рэспублікі Беларусь аб прадастаўленні крэдыту ў памеры 2 млрд доларaў, восенню чакаецца паступленне 440 млн доларaў у выглядзе шостага траншу па лініі ЕўрАзЭС. Гэтыя меры, у сукупнасці з павелічэннем паступленняў ад экспарцёраў, дазволяць Нацыянальнаму Банку ўтрымаць курс рубля ў зададзеных значэннях», — лічыць эксперт.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Утерянный студенческий билет УО «БНТУ» на имя ФАТТАХОВА Альберта Равильевича **считать недействительным.**

Наблюдательный совет «ОАО «Белхозторг»
ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА.
Собрание состоится 24 июля 2014 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 34, 4-ый этаж, комната 401.

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:
1. Об избрании нового состава наблюдательного совета.

Срок подачи списка предлагаемых кандидатур в члены наблюдательного совета с 7 июля по 13 июля 2014 г.

С информацией, подлежащей рассмотрению на внеочередном собрании акционеров, можно ознакомиться на сайте Общества в глобальной компьютерной сети Интернет, Форуме и информационном стенде ОАО «Белхозторг» по адресу: г. Минск ул. Платонова 34, 4-ый этаж.

Регистрация участников собрания 24 июля 2014 года – с 11.00 до 11.50 по месту проведения собрания.

Дата составления списка акционеров 14 июля 2014 г.

Для регистрации при себе иметь:

- акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность.

Наблюдательный совет

УНП 100230626

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона —
Полонковский сельский исполнительный комитет Барановичского района

Местоположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Площадь земельного участка (га)	Назначение участка	Начальная цена объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.)
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Полонковский с/с, д. Лотвичи, ул. Приозерная, д. 16 Кадастровый номер 120488003101000172	Участок свободен от застройки. Водопровода — нет, газопровода — нет	Дорога с асфальтовым покрытием. Имеется линия электропередач. Водопровод не планируется Газапровод не планируется	0,15	Для строительства и обслуживание жилого дома	4019400	401940	6875683 руб. кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона

1. Дата, время и место проведения аукциона: **5 августа 2014 г. в 15.00** в здании Полонковского сельского исполнительного комитета (актовый зал) по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, дер. Полонка, ул. Щербакова, 31.

2. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10%.

4. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка (10% от начальной цены);
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. Сумма задатка перечисляется **до 29 июля 2014 г. включительно до 16.00** на расчетный счет 3604211180007, филиал 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150501245, УНП 200046435, код платежа 04901.

Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а.

Получатель: Полонковский сельский исполнительный комитет, 225332, Брестская область, Барановичский район, д. Полонка, ул. Щербакова, 31.

6. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

7. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи: каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: (8 0163) 43 88 36, 43 88 39.

8. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона и решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни **с 30 июня 2014 г. в комиссии с 8.00 до13.00 и с 14.00 до 17.00** (Полонковский сельисполком).

Последний день приема документов — **29 июля 2014 г. до 16.30.** Заключительная регистрация участников аукциона — **5 августа 2014 г. с 14.30 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по объекту, выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

УНП 200046435

ВАЕННАЕ РЭХА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гады акупацыі на тэрыторыі раёна дзейнічала 6 тысяч партызанаў. 134 узарваныя эшалоны ворага, 89 аўтамашын, 9 мастоў, 8 знішчаных гарнізонаў, каля 10 тысяч забітых фашыстаў — па сваім маштабе дзейянні беларускіх партызанаў не маюць аналагаў у гісторыі вайны!

Безумоўна, партызаны не дабіліся б такіх поспехаў без дапамогі і падтрымкі мясцовага насельніцтва. Практычна ў кожнай вёсцы былі сувязныя, якія перадавалі ў атрады звесткі аб перамяшчэнні немцаў. У некаторых населеных пунктах існавалі нават цэлыя падпольныя групы. На акупаванай тэрыторыі выходзілі падпольныя газеты «Красное знамя», «Партизанский путь», «Народный мститель».

237 крупчан, сувязных і падпольшчыкаў, расстралялі гітлераўцы. Многія былі адпраўлены ў турмы, канцлагеры, адкуль вярнуліся не ўсе. Усяго ад рук акупантаў на Крупшчыне загінула 7371 чалавек. Цалкам было спалена 10 вёсак, часткова знішчана 12 населеных пунктаў.

Клаўдзія Мартынаўна БАРЫСАВА.

ТЭРЫТОРЫЯ ПАМЯЦІ

Крупчане помсцілі як маглі. Адны — на франтах вайны, другія — тут, у тыле ворага. Сваімі подзвігамі і ўчынкамі яны набліжалі вызваленне роднага краю, любай Беларусі. За гэта 2614 жыхароў Крупскага раёна былі ўзнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі. Залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю мясцовасці 17 Герояў Савецкага Саюза, 11 з іх — ураджэнцы Крупшчыны.

Героям крупскай зямлі на тэрыторыі мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея прысвечана Алея Славы. У цэнтры горада пастаўлены камень крупчанам, якія, абараняючы сваю Радзіму, загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Шануюць тут і тых, хто не з'яўляецца земляком, але ўнёс вялікі ўклад у справу барацьбы з ворагам. Аднаму з іх — Васілю Чабатарову — прысвечаны асобны помнік.

УСЁЙ СЯМ'ЁЙ — У ПАРТЫЗАНЫ

Няма ўжо тых, хто ўдзельнічаў у вызваленні Крупскага раёна. Але яшчэ жывыя вызваліцелі іншых населеных пунктаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. На жаль, на Крупшчыне іх засталося ўсяго 32 чалавекі. А тых, хто яшчэ ў страі, — яшчэ менш. Да іх і прывяла наша журналісцкая дарога.

Да Клаўдзіі Барысавай мы паехалі ў вёску Лебедзева, што за тры кіламетры ад райцэнтра. Аб тым, што ў невялічкім драўляным доме жыве ветэран вайны, нагадвае чырвоная зорка, прымацаваная да дзвярэй. Да нас выйшла бабуля, вельмі прыгожая для свайго ўзросту і вельмі не падобная да вясковай. У парадным касцюме, на якім звіняць шматлікія ўзнагароды, з завіўкай, у бліскучых завушніцах і з беласнежнай усмешкай. Нават і не скажаш, што ёй — 93 гады!

— Ніколі не думала, што так доўга пражыву, — адчула наша здзіўленне яна. — Працаваць трэба любіць. Ды, вядома, вайна загартавала...

Вайна для дваццацігадовай дзяўчыны пачалася ў Шклоўскім раёне, дзе яна жыла з бацькамі. Сям'я была вялікая: мама, тата і сямёра дзяцей. Бацьку і двух братоў забралі на фронт. Бацьку забілі ў першыя дні вайны пад Масквой, братоў захапілі ў палон.

— Маці была сувязной у партызанаў, — успамінае Клаўдзія Мартынаўна. — У той дзень ёй трэба было перадаць запіску ў Шклоў. Назбірала цэлую карзіну яек, запіску пад іх паклала і выбралася ў дарогу. Далёка не дайшла: немцы як убачылі яйкі, дык забралі разам з карзінай. У нашу хату прыйшлі праз тры дні: відаць, знайшлі тую запіску. Маму забралі. Мы думалі, што больш ніколі яе не ўбачым.

Толькі яна вярнулася. Уся пабітая, нямоглая. Забрала дзяцей і павяла ў лес.

— Яна толькі потым нам расказала, што ўцякла ад немцаў. Вывелі яе і яшчэ 15 чалавек страляць. Яны з адной жанчынай вырашылі бегчы: маўляў, усё роўна заб'юць. Маці ўскочыла ў пусты хлеў, лягла на падлогу і накрыла сябе дошкай, якая ў кутку стаяла. Так і засталася жывая. Тры дні поўзала каля лесу (параненая была) і нарвалася на партызанаў. Так мы ўсёй сям'ёй пайшлі ў партызаны.

Маці, хворая, з малымі дзецьмі сядзела ў зямлянцы. А яна з братамі, якія ўцяклі з нямецкага палону, і з адной сястрой стала ў строй народных мсціўцаў. Спачатку трапілі ў 112-ты атрад, затым даведаліся пра большы, 115-ты, і перайшлі туды. Атрад размяшчаўся ў горацкіх лясах, каля станцыі Пагодзіна.

Клаўдзія Барысава была радавым байцом. Ніякіх патуранняў! Што хлопцы, мужчыны рабілі, тое і яна з дзяўчатамі. Усе былі роўныя, іначай у партызанах не месца.

На ўсялякія заданні хадзіць даводзілася. Усяго наглядзелася, нацярпелася. Самым страшным было забіць свайго. А ў іх у атрадзе дагавор быў: калі моцна параняць гітлераўцы, то каб свае застрэлілі. Яе прасілі неаднойчы, але так і не змагла...

У партызанскім атрадзе Клаўдзія Барысава ваявала ажно да вызвалення Горак.

— Ніхто не верыў! — успамінае яна. — Партызанаў вывелі з лесу і павялі на мітынг у Горкі. Насустрач беглі людзі, плакалі, спявалі, крычалі ад радасці — і тады мы паверылі.

Пасля вызвалення Клаўдзію Мартынаўну, як і астатніх дзяўчат і жанчын, пакінулі ў Горках. Трэба было аднаўляць горад. Яны арганізоўвалі дзіцячы дом. Сірот збіралі па ўсім раёне, мылі, лячылі і размяшчалі ў вялікім пустым доме. У сваю хату вярнулася праз некалькі тыдняў. На месцы дома быў толькі зруб: ні сцен, ні даху, ні вокнаў. Жыллё будавалі наноў. Адны жанчыны: братоў забралі на фронт.

Пасля вайны Клаўдзія Барысава паехала ў Оршу, уладкавалася на ткацкую фабрыку. Праўда, перад гэтым давялося вучыцца паўгода. Там сустрэла свайго будучага мужа, які працаваў у міліцыі. Пажаніліся ў 1955 годзе і прыехалі сюды, у Крупскі раён, дзе жыла яго маці з нявесткай і дзецьмі. Так і жылі ўсе разам. Нарадзілі дваіх дзяцей, пазней з'явіўся яшчэ сын. Толькі праз некалькі гадоў пабудавалі свой дом, дзе і сустрэла нас ветэранка.

Гэтая маленькая прыгожая жанчына амаль усё жыццё працавала на зямлі. А паралельна насіла пошту — 44 гады! Сёння ёй вельмі цяжка ўсвядоміць, як жыць без сваёй бульбы, агародніны. І зараз, ужо зусім слабая, яна садзіць невялічкі агарод, старанна яго даглядае, а пасля з любоўю дзеліцца ўраджаем з унукамі і праўнукамі, якіх у яе па шэсць.

«ПЕРАМОГУ СУСТРЭЎ НА ХАДУ...»

Да ветэрана вайны Мікалая Гацуры мы прыехалі ў Халопенічы. Непадалёк адсюль ён нарадзіўся, тут жыве і цяпер.

— Да вайны жылі ў вёсцы, — удакладняе Мікалай Сямёнавіч. — Я — адзін мужчына на сям'ю. Бацька памёр яшчэ да вайны.

— Я так зненавідзеў немцаў, што, калі яны прыязджалі, нават не трапляў ім на вочы, — успамінае ветэран.

Аднак увесь час за імі сачыў: куды едуць, дзе размяшчаюцца, чым займаюцца. Гэтыя звесткі і дакладваў партызанам. Насіў ім прадукты, калі-нікалі нейкую вопратку.

— І якраз мне пашанцавала, — расказвае Мікалай Сямёнавіч. — З Масквы ў наш раён даслалі партызанскі атрад, які размясціўся непадалёк ад нашай вёскі. І камандзір атрада пасябраваў з маёй сястрой. Калі ён прыйшоў аднойчы да нас, я набраўся смеласці і папрасіў зброі. І што вы думаеце? Праз некалькі дзён я паехаў да іх у атрад, дзе мне далі і вінтоўку, і 100 патронаў, і нават дзве гранаты-лімонкі!

Мікалай Сямёнавіч ГАЦУРА.

Такі баец быў на вагу золата. Тады і залічылі ў брыгаду імя Кірава атрада «За Перамогу». Пачалі браць на заданні: у асноўным, на засады хадзілі, на пагромы гарнізонаў, калі-нікалі — на чыгунку.

Сваё першае баявое хрышчэнне Мікалай Гацура памятае і дагэтуль. У партызанскі атрад паступіў сігнал, што з Сяльца ў Адамаўку рухаецца група немцаў. На адным з участкаў дарогі зрабілі засаду. Быў там і юнак. Немцы суправаджалі абоз з харчаваннем. Перастрэлка была добрая. Тое, што засталося ад абозу, партызаны забралі ў атрад. Шчасце якое было!

— Толькі пасля той перастрэлкі я зразумеў, што значыць быць пад агнём, што такое страляць самому, — прызнаецца Мікалай Сямёнавіч.

Выходзіць сухімі з вады партызанам удавалася не заўсёды. У той дзень, 16 мая 1944 года, гітлераўцы збіраліся пераходзіць з адной вёскі ў іншую. За імі сачыла група партызанаў з шасці чалавек. У тым ліку і Мікалай Гацура.

— Пачалі па іх страляць, а яны — у адказ, — успамінае ён. — Што тут казаць: іх было больш, лепшым, безумоўна, было і ўзбраенне. І раптам наляцелі нямецкія самалёты і пачалі нас «хрысціць». І мяне цяжка параніла асколкам. Перабіла дзве нагі. Я выйшаў са строю...

Параненага пераправілі за лінію фронту. Так Мікалай Гацура апынуўся ў Віцебскай вобласці. Пазней яго перавозілі з месца на месца. Дэмабілізавалі ў кастрычніку 1944 года. Баец з яго ўжо быў ніякі.

— А куды ехаць, не ведаю, — гаворыць ветэран. — Чуў па радыё, што ўжо і Крупкі вызвалены. Толькі дзе мая сям'я? Ці жывыя яны?

Пісаў лісты, а адказу не атрымліваў. Аднойчы яму напісаў аднапалчанін, які і расказаў, што ўсе жывыя, толькі жывуць ужо ў іншым месцы. У Халопенічах. Туды і прыехаў партызан, у невялічкі закутак у драўлянай хаце...

Пасля вайны Мікалаю Сямёнавічу прапанавалі стаць дырэктарам Дома культуры, пасля яго перавялі ў спецсувязь. Паралельна заканчваў школу. Затым паступіў ва Усесаюзны завочны інстытут сувязі ў Маскву. Райкам партыі вучыцца не адпусціў: прапанавалі працу сакратара ў райвыканкаме. Дзе толькі пасля не працаваў! Амаль заўсёды займаў кіруючыя пасады: былога партызана тут паважалі.

Акрамя баявых узнагарод — ордэна Айчыннай вайны II ступені, медалёў «Партызану Айчыннай вайны», «За Перамогу над Германіяй», Жукава, у Мікалая Гацуры шмат і працоўных адзнак. Ветэранам вайны і ветэранам працы ганарацца дзеці, унукі і праўнукі.

На развітанні Мікалай Сямёнавіч прызнаўся, што ніколі нават не марыў дажыць да 70-годдзя вызвалення Беларусі. Гэта для яго святы дзень.

Валянцін Дзям'янавіч АБРАМОВІЧ на Алеі Славы.

«НАШ АБРАМОВІЧ»

У Крупках яго называюць «наш Абрамовіч». Валянцін Дзям'янавіч заўсёды рады гасцям. Вось і на гэты раз, нягледзячы на паважаны ўзрост, пагадзіўся з намі не толькі пагутарыць — а нават прайсціся па памятных месцах. Спачатку адправіліся да Алеі Славы, якую некалькі гадоў таму адкрываў і ганаровы ветэран.

Калі пачалася вайна, яму было 16. Як пачулі страшную вестку, бацька сказаў: «Нічога, сынок, пабаюемся!» Для іх вайна пачалася з падпольнай арганізацыі, якая аб'ядноўвала камсамольцаў бліжэйшых сельсаветаў. Трымалі цесную сувязь з партызанамі.

— Аднаго з нашых аднойчы злавілі немцы. Ён не вытрываў катаванняў і расказаў пра нас, — успамінае Валянцін Дзям'янавіч. — Нас накрылі. Праўда, не ўсіх. Так я трапіў у турму. Я аказаўся больш вытрыманым: сваім не здрадзіў. Фашысты тады за мяне — і ў лагер ваеннапалонных.

Пашчасціла ўцячы, калі выводзілі на працу. Доўга блукаў, пакуль не знайшоў бацьку. Ён і забраў сына да сябе, у партызанскі атрад імя Варашылава, брыгаду Шчорса. Затым змагаўся з ворагам у атрадзе «За Савецкую Беларусь».

Калі пачалося ўз'яднанне з рэгулярнымі войскамі, партызанаў мабілізавалі на фронт. Валянцін Абрамовіч спачатку трапіў у запасны 366 полк, а пасля трохмесячнай падрыхтоўкі яго накіравалі ў 60 артылерыйскі полк. Ён быў разведчыкам-назіральнікам.

— Сутнасць сапраўднага бою зведаў, калі выратоўваў свайго камандзіра, — расказвае ветэран. — Яго параніла ў абедзве нагі. Добра яшчэ, што на нейтральнай тэрыторыі знаходзіўся. Салдаты — за ім. Ды дзе там! Аднаго параніла, другога забілі. Чую, камандзір мяне кліча. Больш нічога не заставалася, і я папоўз. Узяў з сабой двух салдат. Я ўжо з жыццём развітаўся. Толькі нам пашчасціла больш — і камандзір быў выратаваны.

Перамогу Валянцін Дзям'янавіч сустрэў у шпіталі. Шмат пра вайну гаварыць не любіць. Кажа, што ўзнагароды больш красамоўныя — ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «Партызану Айчыннай вайны». Сёння, па словах ветэрана, лепш гаварыць пра мірнае жыццё. І тут яму ёсць што сказаць: узнагароджаны знакам «Выдатнік сацыялістычнага ўлiку», ордэнам «Знак Пашаны».

Усё жыццё працаваў у райвыканкаме, узначальваў аддзел статыстыкі (пасля фінансавы аддзел). У працоўнай кніжцы — усяго адзін запіс!

Пасля працы ў хатняй цішы ён пісаў вершы на беларускай мове. І ўсе прысвяціў любай жонцы.

Беларускую мову Валянцін Абрамовіч любіць з дзяцінства. На ёй размаўлялі бацькі, увесь час гаворыць ён сам. Нават на выпускным у Маскве ён выступаў з прамовай на роднай мове. Дарэчы, усё жыццё выпісваў «Звязду». Потым быў перапынак. А цяпер паабяцаў, што выпіша зноў. Увогуле, лічыць ветэран, што не было б Перамогі, каб людзі так не шанавалі родную мову, не любілі сваю Радзіму. Каб і хацеў — не паспрачаешся.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Надзеі БУЖАН.
Крупскі раён.

■ Вакол футбола

БАРАЦЬБА ЗА КУБАК ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА!

FIFA WORLD CUP Brasil

«Звязда» адсочвае шлях зборных да плэй-оф. Але хто пройдзе далей?

БРАЗІЛІЯ—ЧЫЛІ

Групавую стадыю зборная Бразіліі прайшла роўна, без надрыву. Хоць пасля нічыёй з Мексікай (і з сумнеўнай перамогай над харватамі ў кішэні) балельшчыкі жоўта-зялёнай каманды маглі сапраўды хвалявацца. Але ў апошнім матчы гаспадары мундзіялю расставілі ўсе кропкі над «і», разграміўшы камерунцаў (4:1). Бразільцы назбіралі сем галоў, пры гэтым у свае вароты прапусцілі толькі два мячы (адзін з якіх — аўтагол Марсела ў стартавым матчы). Як вынік — пуцёўка ў плэй-оф з першага месца.

Галоўная «зорка»: Неймар («Барселона»); 4 галы.

На гэтым чэмпіянаце зборная Чылі адправіла дадому іспанцаў. Свой матч жыцця Клаўдзіа Брава і кампанія згулялі на пяць з плюсам і даказалі, што ўпэўненая перамога над аўстралійцамі ў першым паядынку (3:1) была невыпадковай. Такім чынам, лацінаамерыканцы яшчэ ў другім раўндзе вырашылі пытанне 1/8 фіналу. Паспаборнічаць з галандцамі за лідарства ў групе не атрымалася: «аранжавым» чылійцы саступілі без шанцаў (0:2). Тым не менш выхад у плэй-оф (няхай і з другога месца) з такой складанай групы для каманды Чылі, безумоўна, дасягненне.

Галоўная «зорка»: Алексіс Санчэс («Барселона»); 1 гол.

КАЛУМБІЯ—УРУГВАЙ

У сваёй групе зборная Калумбіі была відавочным фаварытам. Ужо на старце турніру лацінаамерыканцы разгромілі грэкаў (3:0), а прыгожая перамога над івуарыйцамі (2:1) толькі пацвердзіла высокі клас гэтай каманды. Зборнай Японіі калумбійцы забілі яшчэ чатыры галы і з выдатнай розніцай +7 літаральна на адным дыханні выйшлі ў плэй-оф.

Галоўная «зорка»: Хамес Радрыгес («Манака»), 3 галы.

Зборная Уругвая не можа пахваліцца такім жа стыльным праходам у 1/8 фіналу. Тым не менш хлопцам у нябесна-блакітных футболках ёсць чым ганарыцца. Менавіта яны не пусцілі ў плэй-оф зборныя Англіі і Італіі, перайграўшы еўрапейцаў з мінімальнай розніцай — 2:1 і 1:0 адпаведна. Святочны настрой уругвайцам сапсавала хіба што дыскваліфікацыя Луіса Суарэса. Без яго ў матчы з калумбійцамі будзе зусім няпроста.

Галоўная «зорка»: Дыега Гадзін («Атлетыка»), чый гол у вароты Буфона вывеў зборную ў плэй-оф.

ФРАНЦЫЯ—НІГЕРЫЯ

Ад зборнай Францыі мала хто чакаў такой моцнай гульні. Дыдзье Дэшам наглядна прадэманстраваў, што і без Франка Рыберы «трохкаляровыя» могуць быць грознай сілай. Увогуле ў вароты гандурасцаў і швейцарцаў французы забілі восем галоў (для двух матчаў проста выдатны паказчык!). У апошняй сустрэчы з Эквадорам ужо нічога не вырашалася, і безгалявая нічыя каманду задаволіла.

Галоўная «зорка»: Карым Бензема («Рэал»); 3 галы.

У 1/8 фіналу зборная Нігерыі выйшла з адной перамогай: у другім раўндзе перайгралі баснійцаў (1:0). А вось шчыльную абарону іранцаў афрыканцы прабіць не змаглі. Тым не менш баявы і непрадказальны матч з аргенцінцамі (2:3) паказаў, што дзеючыя чэмпіёны Кубка афрыканскіх нацый у выдатнай форме падышлі да мундзіялю. Пагадзіцеся, такі вынік і паражэннем назваць складана.

Галоўная «зорка»: Ахмед Муса (ЦСКА-Масква); два галы (дубль у вароты Аргенціны).

ГЕРМАНІЯ—АЛЖЫР

Яшчэ да старту чэмпіянату зборнай Германіі прадказвалі фінал. Пакуль «бундэсманшафт» з гэтай місіяй спраўляецца няблага. Разгром партугальцаў (4:0) і перамога над амерыканцамі (1:0) ужо праклалі немцам шлях у плэй-оф. А нічыю з камандай Ганы (2:2) Ёахім Лёў, напэўна, успрымае як добрую спаборніцкую практыку.

Галоўная «зорка»: Томас Мюлер («Баварыя»); 3 галы.

Адной перамогі над паўднёваамерыканцамі зборнай Алжыра было недастаткова для выхаду ў 1/8 фіналу. Афрыканцам трэба было любой цаной здабываць нічыю ў матчы з расіянамі. Гол Іслама Слімані на 59-й хвіліне ў вароты Ігара Акінфеева ўпершыню ў гісторыі вывеў алжырцаў у плэй-оф чэмпіянату свету.

Галоўная «зорка»: Іслам Слімані («Спортынг»), 2 галы.

ГАЛАНДЫЯ—МЕКСІКА

Пасля феерычнага матча з іспанцамі ад зборнай Галандыі чакалі толькі перамог. І падапечныя Луі ван Гала не падвялі. На шляху да плэй-оф яны таксама перайгралі аўстралійцаў (3:2) і чылійцаў (2:0). Дарэчы, «аранжавыя» сталі лепшымі бамбардзірамі групавога этапу, запісаўшы на свой рахунак 10 галоў.

Галоўная «зорка»: Вялікі дуэт — Ар'ен Рабэн («Баварыя») і Робін ван Персі («Манчэстэр»); па 3 галы.

А вось з сапернікамі па 1/8 фіналу галандцам не пашанцавала. Мексіканцы, якія ўвесь групавы этап дыхалі ў патыліцу бразільцам, на мундзіялі сапраўды ўражваюць. Гаспадарам турніру «ацтэкі» саступілі толькі па розніцы забітых мячоў. А апошняя перамога над харватамі (3:1) прадэманстравала настрой каманды на плэй-оф.

Галоўная «зорка»: Хаўер Эрнандэс («Манчэстэр»), 1 гол.

КОСТА-РЫКА—ГРЭЦЫЯ

Зборная Коста-Рыкі — галоўная сенсацыя чэмпіянату. Каманда з Цэнтральнай Амерыкі ўраганам пранеслася па групавым этапе, перайграўшы ўругвайцаў (3:1) і італьянцаў. А матч супраць англічан, які нічога не вырашаў ні для адной з каманд, скончыўся безгалявой нічыёй. Вось так намінальныя аўтсайдары групы выйшлі «ў дамкі».

Галоўная «зорка»: Браян Руіс («Фулхэм»), 1 гол.

Зборная Грэцыі — адзіная каманда, якая выйшла ў плэй-оф з адмоўнай розніцай. Галоўныя «ахоўнікі» еўрапейскага футбола змаглі забіць толькі івуарыйцам (2:1). Прычым адзін з галоў рэалізаваны з пенальці. Але гэтай перамогі хапіла, каб упершыню прабіцца ў 1/8 фіналу футбольнага мундзіялю.

Галоўная «зорка»: Ёргас Самарас («Селтык»), чый пенальці ў дадатковы час вырашальнага матча вывеў зборную ў плэй-оф.

АРГЕНЦІНА—ШВЕЙЦАРЫЯ

Свой самы валявы матч зборная Аргенціны правяла ў трэцім раўндзе супраць нігерыйцаў (3:2). Дагэтуль — перамогі над баснійцамі і іранцамі. У выніку адны з фаварытаў турніру элегантна крочаць у плэй-оф.

Галоўная «зорка»: Ліянель Месі («Барселона»); 4 галы.

Калі б не буйное паражэнне французам (2:5), зборная Швейцарыі — адна з самых маладых на чэмпіянаце — магла б пахваліцца нядрэннымі лічбамі. Гандурасцы, напрыклад, змаглі забіць 3 мячы. А стартавая перамога над эквадорцамі (2:1) аказалася, па сутнасці, вырашальнай.

Галоўная «зорка»: Джэрдан Шакіры («Баварыя»); 3 галы.

БЕЛЬГІЯ—ЗША

Бельгійцы апраўдалі статус ценявых фаварытаў і ў досыць слабай групе, як і чакалася, атрымалі тры перамогі. Баявы матч супраць алжырцаў (2:1) на старце чэмпіянату натхніў падапечных Марка Вільмата, і наступныя паядынкі з расіянамі (1:0) і карэйцамі (1:0) еўрапейцы правялі на высокім узроўні.

Галоўная «зорка»: Дрыс Мертэнс («Напалі»); 1 гол.

Зборная ЗША — адна з галоўных нечаканасцяў гэтага турніру. І калі перамога над Ганай (2:1) мала каго ўразіла, то нічыя з партугальцамі (2:2) — гэта сапраўднае дасягненне для зорна-паласатай каманды. А ўпартае супрацьстаянне немцам у апошнім матчы (0:1) дэманструе, што гэтая каманда не такая ўжо і простая.

Галоўная «зорка»: Клінт Дэмпсі («Фулхэм»); 2 галы.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

АЛЕКСАНДРЫЯ ЗНОЎ ЗБІРАЕ СЯБРОЎ

Фестываль «Александрыя збірае сяброў» зноў рыхтуецца прыняць гасцей. На працягу двух дзён — 5 і 6 ліпеня — у маляўнічым куточку Шклоўшчыны на беразе Дняпра будуць працаваць гандлёвыя рады, гучаць спевы, праводзіцца прэзентацыі.

— На чым сёлета робіцца акцэнт свята? Ці будзе яно сапраўды адметным? — пацікавілася «Звязда» ў намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерыя Малашкі.

— Мы развіваем тое лепшае, што ўжо прыжылося і, паколькі гэта юбілейны форум, яшчэ больш пашыраем так званую палітру нашых узаемаадносін і супрацоўніцтва паміж Беларуссю, Расіяй і Украінай, — адзначыў ён. — Расія прэзентуе Ніжагародскі кірмаш, удзельнікі якога вязуць нават канструкцыі для афармлення сваёй пляцоўкі. А вось украінскім сябрам стварыць неабходны антураж дапаможам мы. Тэмай сяброўства будзе красякнуты і канцэрт, у якім прымуць удзел вядомыя беларускія, расійскія і ўкраінскія артысты. На свята запрошаны Надзея Бабкіна, «Іванушкі International», артысты расійскага цэнтра імя Генадзя Завалокіна «Іграй, гармонь», пераможца тэлепраекта «Голас» на Першым расійскім канале, наш зямляк з Быхава Сяргей Ваўчкоў, маладая спявачка з Украіны Анастасія Прыходзька. У харэаграфічных кампазіцыях сімвалічна будзе прадстаўлена ўсё тое, чым ганарацца нашы братэрскія народы, — слуцкі пояс, паўлапасадская хустка, украінская вышыванка. У рамках форуму адбудуцца святы бульбы і льну, будзе працаваць цікавы сельскі падворак з выставай жывёл, наведвальнікі пабачаць парасячыя і гусіныя гонкі.

Наогул мы чакаем шмат гасцей, таму плануецца павялічыць колькасць гандлёвых кропак, пасадачных месцаў, аб'ёмаў квасу і шашлыку. Рыхтуюцца вельмі цікавыя гульнявыя і анімацыйныя праграмы. Форум праходзіць на беразе ракі Днепр, якая заўсёды з'яўлялася сімвалам братэрства. Каб прадэманстраваць гэта наглядна, на адной з пляцовак з'явіцца «рака» з палатак, якія будуць аб'ядноўвацца адзіным слоганам: «Днепр — рака дружбы». Там майстры з розных краін будуць гандляваць вырабамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Александрыйскае Купалле наведаюць гандлёвыя прадстаўнікі 28 пасольстваў. Яны будуць працаваць па асобнай праграме Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Архиепископ Полоцкий и Глубокский Феодосий 10 июня 2014 года совершил освящение колоколов для строящегося храма в честь великомученика и целителя Пантелеимона Полоцкой городской больницы №1.
Освящение пяти колоколов состоялось на территории ОАО «Технолит Полоцк».

ПРИГЛАШАЕМ К СОТРУДНИЧЕСТВУ!
Полезный адрес:
ОАО «Технолит Полоцк», г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47.
Тел./факс +375 214 42 51 17, E-mail: technolit@mail.ru

ОАО «ТЕХНОЛИТ ПОЛОЦК» –
КОЛОКОЛЬНОМУ ЗВОНУ – БЫТЬ!

ОАО «Технолит Полоцк» подчиняется Министерству промышленности Республики Беларусь. Предприятие в настоящее время специализируется на производстве изделий из серого чугуна разнопланового применения, канализационных, телефонных люков; дождеприемников, печного литья, стойлового оборудования, решеток для животноводческих комплексов в широком ассортименте и т.д.

Стоит отдельно выделить художественное литье, благодаря которому предприятие получило известность не только в РБ, но и за рубежом.

Самые значимые подобные сооружения, воздвигнутые «Технолитом», – это памятники героям войны 1812 года (один из которых установлен в Полоцке), а также бронзовая конная скульптура князя Ольгерда, основателя витебских замков, установленная в городе Витебске.

Недавно ОАО «Технолит Полоцк» впервые отлил колокола из сплава металлов: меди на 80% и олова на 20%. Вес колоколов: 12 кг, 16 кг, 32 кг, 36 кг и 105 кг. Над их созданием работало 6 человек литейного цеха. Они делали формовку и отливку. Первый опыт оказался удачным.

На сегодняшний день в Витебской области ОАО «Технолит Полоцк» – единственная организация, которая освоила производство бронзовых звонных колоколов в широком ассортименте.

Предприятие готово удовлетворить любые пожелания заказчиков.

ОАО «Технолит Полоцк»
г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47
Тел. факс: +(375 214) 42 51 17, 42 62 09

УНП 300083521

Малінавы смак у грашовым эквіваленце,

або Як зарабіць на кватэру за 2-3 сезоны?

Амаль усе жыхары некалькіх населеных пунктаў на поўначы ад Гомеля рэзка памянялі жыццёвы рэжым. Сезон малін у разгары, і таму зборшчыкам уставаць трэба як мага раней. Пяшчотную ягаду, якая наспела за папярэдні дзень, важна сабраць да прыезду аптовых закупшчыкаў.

Вось і ў Юліі Барыскінай з вёскі Яроміна працоўны дзень на малінах пачынаецца ў 5 раніцы. Разам з дачкой Святланай, якая прыехала з Бельгіі на сезон дапамагаць маці, яны ідуць па доўгіх радах — акуратна збіраюць буйныя ягады ў папяровыя скрыначкі, разлічаныя роўна на адзін кілаграм, — каб у той жа ўпакоўцы ласунак дайшоў да спажыўца. Дарэчы, накіроўваецца ягада традыцыйна ў сталіцу Расіі. Масква паглынае ўсю беларускую маліну і яшчэ просіць.

— Гэта наш бізнес, — кажа Юлія Барыскіна. Таму днямі не вылазім з гэтай маліны. Шкада вось толькі, што сёлета яе вельмі шмат прапала. Хварэе чамусьці і засыхае. Магчыма, гэта ад той спякоты, што апошнім часам была ў нас летам. Холаду маліна не баіцца, дождж вельмі любіць, а вось спякоту цяжка пераносіць.

Саджаць маліну плантацыямі на поўначы ад Гомеля пачалі адносна нядаўна, гадоў 15-20 таму. Пасля таго, як мясцовыя прыватнікі сцямілі, што гэта можа стаць выгадным бізнесам. З таго часу адладжвалася лагістыка, і сёння ёй падпарадкаваны ўсе, хто хоча на маліне грошы зарабіць. Таму і сну няма — ездуць і ездуць мікрааўтобусы са спецыяльнымі палічкамі пад скрыначкі, збіраюць ягаду і разлічваюцца «жывымі» грашыма.

Апошнім часам на маліну ўсталявалася аптовая цана ў Br20 тысяч за кілаграм. Пры тым, што на гомельскіх рынках у розніцу — 30-35 тысяч. Самая першая ягада была ўдвая даражэй. Па меры паспявання і напаўнення рынку кошт імгненна зніжаўся. Юлія Уладзіміраўна па самай высокай цане паспела здаць толькі 5 кілаграм, але і цяпер, лічыць, нядрэнна будзе:

— Штодзень я збіраю 25-26 кілаграмаў. Сезон працягнецца месяц, а, можа, і даўжэй. Зямля ў нас добрая для маліны, але і догляду яна патрабуе вялікага.

Колькасць пасадак тут вылічваюць не соткамі, а метрамі. У пенсіянеркі Юліі Уладзіміраўны, па прыблізных падліках, больш за 300 метраў малін. У некаторых суседзяў — удвая-утрая больш. Вось і ўявіце, колькі часу патрабуецца, каб усё кустоўе да ладу прывесці. Умовы надвор'я прыходзіцца ўлічваць і папярэджваць, па магчымасці, іх наступствы. Атрымліваецца не заўсёды:

— Цяжка вельмі наскубаць гэтыя кілаграмы, — гаворыць Юлія Уладзіміраўна. — Але ж некаторыя ў дзень набіраюць і па 80. У асобных атрымліваецца на кватэру ў горадзе зарабіць за 2-3 сезоны, калі маліна добрая. Мы не ведаем, па якой цане ў Маскве нашу ягаду здаюць. На здароўе — няхай купляюць і ядуць расіяне.

Для вёсак Хальч, Яроміна, Пакалюбічы, Новае Жыццё і некаторых іншых у Гомельскім раёне маліны — як клубніцы для Брэстчыны або агуркі для Шклова ці Турава. Аднак большасць тут не жыве за выручаныя грошы цэлы год. Часцей плануюць за сезонны заробак зрабіць нейкую вялікую пакупку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

ЧЫМ БАГАТЫ — ТЫМ І РАДЫ

Кажуць, у «клубнічнай сталіцы» Беларусі — вёсачцы Дварэц, што на Брэстчыне, за сезон на продажы клубніц можна зарабіць да 100 мільёнаў рублёў. Пэўна ж, у маштабах стыхійных сталічных рынкаў казаць пра такія грошы не даводзіцца, але для многіх гандляроў гэта істотны дадатак да зарплаты і пенсіі.

— Пачым чарніцы? — пытаюся ў даволі маладой яшчэ жанчыны, якая прадае матава-сінія ягады.

— Дваццаць тысяч за паўлітра, — адказвае тая і ўгаворвае набыць, бо ў наступны раз з'явіцца тут толькі праз тры дні. Але набываць ягады па дарозе на працу не надта зручна, вось каб можна было вярнуцца па іх увечары...

— Увечары я не працую, — адказвае жанчына, вольная вызначаць свой графік так, як ёй зручна.

Але я не засмучаюся з-за страчанай магчымасці набыць ласунак, бо ўжо не адзін дзясятак гадоў гэтае «святое» для вулічных гандляроў месца не пусцее. «Самадзейны кірмаш» на працягу дня перамяшчаецца тут па дзвюх кропках. Пік актыўнасці на першай з іх, што знаходзіцца на шляху ад жылога квартала да транспартных прыпынкаў, прыходзіцца на 7 — 8 гадзін раніцы: уздоўж невялічкай узбочыны тут можна адначасна налічыць некалькі дзясяткаў гандляроў. Менавіта ў гэты час людзі, ідучы на працу, могуць прыхапіць з сабой шклянку духмяных ягад, а клапатлівыя гаспадыні прыходзяць сюды, каб набыць свежага малака, дамашняга тварагу і яек да сняданку. Купляць «з рук» людзі не баяцца: давяраюць працавітым бабулькам, якім нявыгадна губляць пастаянных кліентаў, прадаючы ім няякасныя прадукты. Да абеду гандлёвая пляцоўка «перадыслацыруецца» на 300 метраў бліжэй да транспарту, і тут ужо да вечара могуць «атаварыцца» людзі, якія вяртаюцца з працы. Асартымент амаль што не мяняецца: тыя ж садавіна і агародніна, грыбы, ягады, марынады; дадаюцца да ўсяго гэтага хіба што кветкі, вырашчаныя на дачных участках.

Вось пажылая жанчына з пафарбаванымі ў «блонд» валасамі, закручанымі ў мудрагелістую прычоску, прадае бліскучыя чорныя парэчкі ў пластыкавых вядзерцах з-пад маянэзу. Просіць 25 тысяч за адно.

— Бярыце: буйная, перабраная, — на рынку гэтая ягада 30 тысяч каштуе, а выгляду ў яе ніякага, — заахвочвае мяне гандлярка.

Багата тут і іншых ягад. І цэны на іх уражваюць як сваёй дарагавізнай, так і хуткай зменлівасцю. Напрыклад, за паўлітровы слоік духмяных лясных суніц просяць ажно 40 тысяч. А такі ж аб'ём чырвоных парэчак аддаюць за 10.

— Калі возьмеце літр, аддам па пяць, — намагаецца схіліць на свой бок бойкая прадаўшчыца жанчыну, якая сумняваецца, ці патрэбны ёй ягады. Тая спрабуе пярэчыць: столькі не трэба. «Добра, бярыце паўлітра за пяць тысяч», — махае рукой раптоўна шчодрая гандлярка.

На стыхійным рынку ўсё яшчэ не страчваюць папулярнасці згаданыя ўжо клубніцы — загарэлы хударлявы мужчына аддае трохлітровае вядро за 55 тысяч. А яшчэ адзін з самых жаданых летніх ласункаў — сонечна-жоўтыя лісічкі, сезон якіх яшчэ будзе працягвацца даволі доўга, — прадаюць па 25 тысяч за літр.

Хоць стыхійны гандаль і не дазволены афіцыйна, ён працягвае жыць і не страчвае сваёй папулярнасці ў пакупнікоў. Тут свае законы цэнаўтварэння і свая атмасфера. І часам ладны пучок пятрушкі, куплены за тры тысячы ў бабулькі, якая размясцілася акурат пад надпісам «Несанкцыянаваны гандаль тут забаронены», падаецца больш духмяным і смачным, чым той, што набылі ў супермаркеце. Можа быць, таму, што вырашчаны з душой?

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ЗА АГУРКІ МОЖНА АТРЫМАЦЬ УТРАЯ БОЛЬШ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ

Сезон нарыхтоўкі садавіны і агародніны ў разгары. Сёлета арганізацыі спажывецкай кааперацыі плануюць закупіць у насельніцтва не менш за 30 тысяч тон бульбы, 48 тысяч тон гародніны, 115 тысяч тон пладоў і ягад, а таксама 4 тысячы тон лясной прадукцыі.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Белкаапсаюза, за студзень—май 2014 года за здадзеную прадукцыю і сыравіну насельніцтву выплачана 454,6 млрд рублёў.

Цяпер актыўна вядзецца нарыхтоўка агуркоў і капусты. За першую палову чэрвеня ў насельніцтва закуплена 2,1 тысячы тон агуркоў і 1,2 тысячы тон белакачаннай агародніны.

Арганізацыі спажыўкааперацыі ўжо прыступілі да нарыхтоўкі суніц садовых. Апроч таго, з пачатку года ў насельніцтва закуплена 3,6 тысячы тон бульбы, 7 тысяч тон агародніны, 2,9 тысячы тон пладоў і ягад.

Закупачныя цэны на пералічаную прадукцыю для прамысловай пераапрацоўкі ўстанаўліваюць прадпрыемствы-перапрацоўшчыкі. Па дамоўленасці з канцэрнам «Белдзяржхарчпрам», сёлета суніцы садовыя ў залежнасці ад якасці закупаюцца па наступных цэнах: таварныя — па 11—15 тысяч рублёў за кілаграм, нестандартныя — для вінаробства — па 2,2 тысячы (летась было 2 тысячы), для кансервавання — па 3,5 тысячы рублёў за кілаграм (летась — па 3 тысячы).

Закупачныя цэны на агуркі, капусту і іншую агародніну фарміруюць попыт і прапанова. Так, у Столінскім раёне агуркі і капусту ў сярэдзіне чэрвеня закупалі па 7 і 3—3,5 тысячы рублёў адпаведна. Адметна, што летась за кілаграм агуркоў насельніцтву выплачвалі 2—2,5 тысячы, цэны ж на капусту не змяніліся.

Закупачныя цэны на дарункі лесу — чарніцы, лісічкі і белыя грыбы — будзе вызначаць не ўнутраны рынак, а еўрапейскі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

МАЙ «ЗАМАРОЗІЎ» ЧАРНІЦЫ, АЛЕ ДАЎ ШАНЦ ЛІСІЧКАМ

«Агульная ўраджайнасць ягадных раслін і ядомых грыбоў зменшылася ў параўнанні з леташнімі паказчыкамі, — паведаміла **кансультант аддзела зямель і ландшафтаў Мінпрыроды Таццяна ТРАХІМОВІЧ.** — Даследаванні, праведзеныя ў красавіку—чэрвені паказалі: чарніц улетку будзе мала, толькі па поўначы краіны магчымы сярэднія ўраджаі».

«Вялікую шкоду ягаднікам — бутонам, кветкам, маладым пабегам — нанеслі майскія замаразкі, якія праходзілі па значнай тэрыторыі Беларусі, — адзначыла спецыяліст. — Асабліва гэта датычыцца чарніц, бо яны пачалі цвісці ў паўднёвых рэгіёнах краіны з 25 красавіка. Больш познім журавінам удалося пазбегнуць шкоды».

Па буйкі варта ехаць на поўнач краіны, а вось у Мінскай і Магілёўскай абласцях ураджаю амаль не будзе. Па прагнозах, больш чым дзе журавін збяруць у Брэсцкай і Магілёўскай абласцях, трохі менш — на поўначы і поўдні краіны.

Прагноз тэрмінаў пачатку збору чарніц: з 17 чэрвеня — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях, з 20 чэрвеня — у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай, з 25 чэрвеня — у Віцебскай. Брусніцы можна будзе збіраць: з 8 жніўня ў Брэсцкай, з 11 — у Гомельскай, з 13 — у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай, 16 жніўня — у Віцебскай вобласці. Пачатак збору журавін у Брэсцкай і Гомельскай абласцях мяркуецца з 20 жніўня, у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай — з 22, у Віцебскай — з 25 жніўня.

Дзякуючы майскім ліўням ужо заўважаны першыя «хвалі» лісічак, баравікоў, абабкаў, падасінавікаў і маслякоў. Але ў цэлым масавае пладанашэнне грыбоў будзе залежаць у першую чаргу ад далейшага надвор'я. Даныя маніторынга сведчаць, што па ўсёй тэрыторыі краіны мала будзе баравікоў, падасінавікаў і абабкаў, затое чакаецца сярэдні ўраджай лісічак і апенек.

Кацярына РАДЗЮК.

КАМЕРЦЫЙНАЯ ТАЙНА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ паспяховай нарыхтоўцы не спрыяюць дажджы. Па-першае, у лесе дажджом доўга не папрацуеш, па-другое, мокрыя ягады ніхто не возьме. Але патроху збор чарніц ідзе. Сезон пачаўся з панядзелка, ужо закладзена ў халадзільнікі першыя пяць тон. Чарніцы прымаюць ад насельніцтва па цане 21 тысяча рублёў за кілаграм. Нарыхтоўшчыкі ад раённага спажыўтаварыства працуюць у кожным сельсавеце, у гэтым сезоне іх больш за 40 чалавек. Ягады прымаюць ад насельніцтва таксама вясковыя крамы.

Хоць ураджай небагаты і канкурэнцыя з боку прыватнікаў адчуваецца, Таіса Пятроўна спадзяецца, што сотню тон удасца нарыхтаваць. Справа выгадная. Чарніцы ахвотна бяруць партнёры з Літвы, Польшчы, Францыі, іншых краін.

У справе нарыхтовак прыватныя фірмы часам працуюць больш актыўна і мабільна, чым спажыўкааперацыя, лічаць у Івацэвіцкім райвыканкаме. Прыватнікі, паглядзеўшы, што кааператары паставілі цану ў 21 тысячу, даюць 22 тысячы рублёў за кілаграм і адбіваюць у дзяржаўнай структуры зборшчыкаў. Любы чалавек можа займацца нарыхтоўкай ягад, папярэдне накіраваўшы паведамленне ў раённы выканаўчы камітэт. Сёлета Івацэвіцкі райвыканкам атрымаў 33 такія паведамленні. Прыватныя нарыхтоўшчыкі працуюць толькі ў лесе. У раёне васьмі-дзявяці гадзін вечара прыязджаюць машыны з Пінска, Іванава, Ганцавіч і забіраюць ягады. Прыватныя прадпрыемствы ў названых гарадах маюць свае халадзільныя ўстаноўкі, замарожваюць ягады і адпраўляюць на экспарт. Паводле слоў галоўнага спецыяліста аддзела эканомікі райвыканкама Таццяны Чыж, з суботы пачнуцца рэйды па лясных масівах па праверцы захавання законнасці нарыхтоўшчыкамі. У рэйдавыя групы ўваходзяць прадстаўнікі аховы прыроды, санітарнай службы, падатковай інспекцыі, а таксама лясгасаў. Спецыялісты глядзяць найперш, якім чынам ідзе збор ягад, каб папярэдзіць выкарыстанне механічных прыстасаванняў, што наносяць шкоду або наогул знішчаюць расліну. З кожным годам парушальнікаў становіцца менш, бо людзі ведаюць, які штраф можна атрымаць за такія парушэнні. Але ж кантроль не перашкодзіць.

Цікава, што не паўсюдна прыватнікі працуюць аднолькава. Калі ў Івацэвічах іх заслужана пахвалілі, то ў іншых раёнах іх, бывае, скардзяцца. Роўна год таму на выязной сесіі абласнога Савета вяскоўцы ў Гарадной Столінскага раёна расказвалі старшыні аблсавета Сяргею Ашмянцаву, што прыватныя нарыхтоўшчыкі трымаюць сваю цану, ніжэйшую, чым у спажыўкааперацыі, а апошняя спазняецца з пачаткам сезона. Тады пасля ўмяшання кіраўніка абласной прадстаўнічай улады сітуацыю выправілі за дзень-другі. Сёлета давялося пачуць, што ў Кобрынскім раёне прыватнікі бяруць чарніцы па 15 тысяч за кілаграм. Вось і сям'я Кабрынцоў з пасёлка Гарадзец здавала чарніцы спачатку нарыхтоўшчыкам, а потым вырашыла, што выгадней будзе самім вазіць ягады ў Брэст і прадаваць. На цэнтральным рынку яны прапануюць чарніцы па 25 тысяч за літровы слоік. Галоўнай зборшчыцай чарніц стала Іна, малодшая дачка са шматдзетнай сям'і. Дзяўчынка сёлета перайшла ў восьмы клас. А чарніцы збірае кожнае лета, лічы, з дзясяці гадоў.

— Два, тры, а калі і чатыры дні на тыдзень прыносіць з лесу па вядры ягад, — не нахваліцца на дзяўчынку яе сваячка, — а ўжо рукі спрытныя! Так хуценька збірае, мала хто з дарослых з ёй зраўняецца.

Летам Іна Кабрынец зарабляе для сямейнага бюджэту прыстойную суму. На пытанне, колькі, дзяўчынка ўсміхнулася: «Камерцыйная тайна». Але сказала, што гэтага хапае, каб купіць усё неабходнае да новага вучэбнага года ды і нешта такое, пра што марыла. Тата Іны працуе трактарыстам, мама таксама была перадавой трактарысткай у калгасе, але па стане здароўя вымушана была змяніць працу. Часам збіраць ягады Іне дапамагае 18-гадовы брат. Цану грошам у гэтай сям'і ведаюць змалку. А таму збор ягад тут не хобі, а сур'ёзная справа. Яшчэ Іна выказала шкадаванне, што сёлета не ягадны год, чарніц значна менш, чым летась, і яны драбнейшыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Открытое акционерное общество «Хоум Кредит Банк»

Республика Беларусь,
220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91, www.homecredit.by

Отчет о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2013 года

В миллионах белорусских рублей

	Прим.	2013	2012 (пересчитан)
АКТИВЫ			
Денежные средства и их эквиваленты	5	550,711	413,574
Финансовые активы, учитываемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток	24	140,793	139,456
Средства в банках и прочих финансовых организациях	6	8,475	8,508
Кредиты клиентам	7	1,327,463	952,867
Актив по текущему налогу на прибыль		-	1,744
Нематериальные активы	8	53,300	36,004
Основные средства	9	38,935	30,830
Отложенный налоговый актив	14	1,381	-
Прочие активы	10	35,268	12,922
Итого активы		**2,156,326**	**1,595,905**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Финансовые обязательства, учитываемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток	24	447	456
Текущие счета и депозиты клиентов	11	880,911	764,530
Средства банков и прочих финансовых организаций	12	680,179	367,305
Субординированный займ	13	138,648	150,359
Обязательство по текущему налогу на прибыль		35,584	-
Отложенное налоговое обязательство	14	-	6,723
Прочие обязательства	15	46,025	17,254
Итого обязательства		**1,781,794**	**1,306,627**
КАПИТАЛ			
Акционерный капитал	16	371,611	371,611
Прочие увеличения капитала	16	19,585	19,585
Резервный фонд	16	17,107	16,002
Нераспределенная прибыль / (Накопленные убытки)		(33,771)	(117,920)
Итого капитал		**374,532**	**289,278**
Итого обязательства и капитал		**2,156,326**	**1,595,905**

Отчет о совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

В миллионах белорусских рублей

	Прим.	2013	2012 (пересчитан)
Процентные доходы	17	685,511	477,181
Процентные расходы	17	(255,914)	(267,131)
Чистые процентные доходы		**429,597**	**210,050**
Комиссионные доходы	18	86,408	44,687
Комиссионные расходы	19	(40,631)	(40,321)
Чистые комиссионные доходы		**45,777**	**4,366**
Прочие операционные расходы	20	(15,517)	(22,231)
Операционные доходы		**459,857**	**192,185**
Убытки от обесценения	21	(63,684)	(17,718)
Общие административные расходы	22	(239,310)	(178,417)
Операционные расходы		**(302,994)**	**(196,135)**
Прибыль/(убыток) до налогообложения и отражения убытка по чистой монетарной позиции		**156,863**	**(3,950)**
Расходы по налогу на прибыль	23	(31,651)	(3,090)
Прибыль/(убыток) до отражения убытка по чистой монетарной позиции		125,212	(7,040)
Убыток по чистой монетарной позиции вследствие влияния инфляции	25	(39,958)	(48,472)
Чистая прибыль/(убыток) за год		**85,254**	**(55,512)**
Итого совокупная прибыль/ (убыток) за год		**85,254**	**(55,512)**

Отчет об изменениях в капитале за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

В миллионах белорусских рублей

	Прим.	Акционерный капитал	Прочие увеличения капитала	Резервный фонд	Нераспределенная прибыль / (Накопленный убыток)	Итого
Остаток на 1 января 2013 года	16	318,979	16,810	13,736	(101,226)	248,299
Пересчет данных прошлого года с учетом гиперинфляции	2(г)	52,632	2,775	2,266	(16,694)	40,979
Остаток на 1 января 2013 года (пересчитан)		371,611	19,585	16,002	(117,920)	289,278
Чистые отчисления в резервный фонд	16	-	-	1,105	(1,105)	-
Чистая прибыль за год		-	-	-	85,254	85,254
Итого совокупная прибыль за год		**-**	**-**	**1,105**	**84,149**	**85,254**
Итого изменения		**-**	**-**	**1,105**	**84,149**	**85,254**
Остаток на 31 декабря 2013 года		**371,611**	**19,585**	**17,107**	**(33,771)**	**374,532**
Остаток на 1 января 2012 года	16	305,063	16,079	8,331	(46,432)	283,041
Пересчет данных прошлого года с учетом гиперинфляции		66,548	3,506	1,816	(10,121)	61,749
Остаток на 1 января 2012 года (пересчитан)		371,611	19,585	10,147	(56,553)	344,790
Чистые отчисления в резервный фонд	16	-	-	5,855	(5,855)	-
Чистый убыток за год		-	-	-	(55,512)	(55,512)
Итого совокупный (убыток)/ прибыль за год		**-**	**-**	**5,855**	**(61,367)**	**(55,512)**
Итого изменения		**-**	**-**	**5,855**	**(61,367)**	**(55,512)**
Остаток на 31 декабря 2012 года		**371,611**	**19,585**	**16,002**	**(117,920)**	**289,278**

Отчет о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

В миллионах белорусских рублей

	Прим.	2013	2012 (пересчитан)
Операционная деятельность			
Прибыль/(убыток) до отражения убытка по чистой монетарной позиции		125,212	(7,040)
Корректировки на:			
Чистый убыток/(прибыль) от выбытия основных средств и нематериальных активов		253	(172)
Нереализованный убыток / (прибыль) от курсовых разниц		19,746	(3,567)
(Прибыль)/убыток от производных финансовых инструментов	20	(10,691)	18,689
Убытки от обесценения	21	63,684	17,718
Амортизация и износ	22	27,700	25,983
Расходы по налогу на прибыль	23	31,651	3,090
Чистый денежный поток до изменений в оборотном капитале		**257,555**	**54,701**
Изменения средств в банках и других финансовых организациях		33	699
Изменения кредитов клиентам		(457,497)	(356,945)
Изменения финансовых активов, учитываемых по справедливой стоимости через прибыль или убыток		59	152,713
Изменения прочих активов		(22,346)	26,634
Изменения текущих счетов и депозитов клиентов		149,276	549,006
Изменения прочих обязательств		28,771	3,910
Денежные потоки (использованные в)/ от операций		**(44,149)**	**430,718**
Налог на прибыль (оплаченный)/ возмещенный налоговыми органами		(1,476)	3,304
Денежные потоки (использованные в)/ от операционной деятельности		**(45,625)**	**434,022**
Инвестиционная деятельность			
Приобретение основных средств и нематериальных активов		(53,550)	(53,460)
Денежные потоки, использованные в инвестиционной деятельности		**(53,550)**	**(53,460)**
Финансовая деятельность			
Погашение субординированного займа		(10,191)	(10,322)
Поступления средств от банков и других финансовых организаций		3,073,677	1,474,156
Погашение задолженности по средствам банков и других финансовых организаций		(2,782,119)	(1,506,627)
Денежные потоки от/ (использованные в) финансовой деятельности		**281,367**	**(42,793)**
Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов		182,192	337,769
Денежные средства и их эквиваленты по состоянию на 1 января		413,574	121,374
Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты		(64,788)	(48,310)
Влияние колебаний обменного курса на доступные денежные средства		19,733	2,741
Денежные средства и их эквиваленты по состоянию на 31 декабря	**5**	**550,711**	**413,574**

От имени руководства Банка:

Сергей Щербаков
Председатель Правления

Галина Лаптенок
Главный бухгалтер

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 18, выданная НБ РБ 24 мая 2013 года. УНП 807000056.

KPMG

ООО «КПМГ»
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

Заключение независимых аудиторов

Акционерам ОАО «Хоум Кредит Банк»

Мы провели аудит прилагаемой финансовой отчетности ОАО «Хоум Кредит Банк» («Банк»), которая включает в себя отчет о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2013 года, отчеты о совокупном доходе, изменениях в капитале и движении денежных средств за год, закончившийся этой датой, а также примечания, включающие краткое изложение основных принципов учетной политики и прочую поясняющую информацию, изложенные на страницах 6-47.

Ответственность руководства за подготовку финансовой отчетности

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и достоверное представление данной финансовой отчетности в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, а также за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой.

Ответственность аудиторов

Наша обязанность состоит в выражении мнения о данной финансовой отчетности на основании проведенного нами аудита. Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита. Эти стандарты обязывают нас соответствовать этическим нормам, а также планировать и проводить аудит таким образом, чтобы получить разумную уверенность в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в финансовой отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в финансовой отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению финансовой отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством, и оценку общего представления финансовой отчетности.

Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения о данной финансовой отчетности.

Мнение аудиторов

По нашему мнению, финансовая отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2013 года, а также финансовые результаты его деятельности и движение денежных средств за год, закончившийся этой датой, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

Поясняющий параграф

Не делая оговорок, мы обращаем внимание на тот факт, что, как указано в Примечании 2, в 2012 и 2013 годах экономика Республики Беларусь была признана гиперинфляционной согласно Международному стандарту бухгалтерского учета 29 «Финансовая отчетность в условиях гиперинфляции». Функциональной валютой Банка является белорусский рубль и, соответственно, финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, включая соответствующую информацию, была скорректирована в соответствии с МСБУ 29.

Ирина Верещагина
Партнер
ООО «КПМГ»
Минск, Беларусь

7 марта 2014 года

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор аукциона — Верховичский сельский исполнительный комитет

№ лота	Местоположение земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Назначения земельных участков в соотв. с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Сумма подлежащих возмещению затрат на оформление и регистрацию участка, руб.
1	Брестская обл., Каменецкий район, д. Волкоставец, 11А	124080401801000022	0,25	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 1 09 02)	Земельный участок с наличием инженерной и транспортной инфраструктуры. Ограничение в использовании на площади 0,0140 га в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт	3503500	700000	6372650 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ
2	Брестская обл., Каменецкий район, д. Волкоставец, 15	124080401801000023	0,25	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 1 09 02)	Земельный участок с наличием инженерной и транспортной инфраструктуры. Ограничение в использовании на площади 0,0076 га в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт	3503500	700000	6114100 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ

1. **Аукцион состоится 07.08.2014 г. в 16.00 в здании Верховичского сельского исполнительного комитета (зал заседаний) по адресу: Брестская, обл., Каменецкий район, д. Верховичи, ул. Советская, д. 8.**

2. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка. Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется в срок до 05.08.2014 г. *на расчетный счет Верховичского сельского исполнительного комитета 3604219020017, филиал ОАО «Белагропромбанк» — Брестского областного управления МФО 150501401, УНП 200057114, ОКПО 04420271.*

Для участия в аукционе представляются:

гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц — документ, удостоверяющий личность.

3. Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона:

3.1 по продаже земельных участков в частную собственность:

- внесение победителем аукциона платы за земельный участок;

- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

- осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после принятия решения исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

- занятие (освоение) земельного участка не позднее 1 (одного) года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

4. **Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: Брестская обл., Каменецкий район, д. Верховичи, ул. Советская, д. 8. Прием заявлений заканчивается 05.08.2014 г. в 15.00. Контактный телефон: (801631) 42136, тел./факс (801631) 42282.**

5. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан оплатить стоимость объекта продажи, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам необходимой документации.

6. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительного осмотра земельных участков.

Контактные телефоны: (801631) 42136, 42282.

Утерянный страховой полис ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии ИС № 0496178 **считать недействительным.**

УНП 100219645

СП ЗАО «Могилевский химкомбинат» «Заря»

10 июля 2014 года в 14.00

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.

Повестка дня:

1. О выкупе акций Общества у акционеров Копытовой В.Е., Шатикова Н.Н., Ермоленко Н.И., Кирпичниковой О.В. в соответствии с Постановлением апелляционной инстанции экономического суда Могилевской области от 09.10.2013 г. по делу № 32-9/2013/131А.

2. Об одобрении сделки по выкупу акций у акционера Копытовой В.Е., совершенной во исполнение Постановления апелляционной инстанции экономического суда Могилевской области от 09.10.2013 г. по делу № 32-9/2013/131А.

3. Об утверждении проектов договоров купли-продажи ценных бумаг, заключаемых с акционерами Шатиковым Н.Н., Ермоленко Н.И., Кирпичниковой О.В. во исполнение Постановления апелляционной инстанции экономического суда Могилевской области от 09.10.2013 г. по делу № 32-9/2013/131А.

4. Об обжаловании в порядке надзора Постановления апелляционной инстанции экономического суда Могилевской области от 09.10.2013 г. по делу № 32-9/2013/131А.

Начало регистрации участников собрания **в 13.00**. Окончание регистрации **в 13.50.**

Место проведения собрания: **г. Могилев, пр. Шмидта, 114.** Отправление автобуса от ТЭЦ-2 **в 13.00.**

Регистрация производится при предъявлении документа удостоверяющего личность, для представителя акционера – доверенности.

Наблюдательный Совет.

УНП 700210051

Апавяданне

Алесь БАДАК

ІДЭАЛЬНЫ ЧЫТАЧ

НАСТАЎНІК не можа марыць пра ідэальнага вучня, таму што ідэальны вучань заўсёды лепшы за настаўніка, з-за чаго той у глыбіні душы адчувае сваю недасканаласць. Гэтаксама як хірург не можа марыць пра ідэальнага хворага, бо ідэальны хворы — гэта, як вядома, той, хто хворы невылечна, а які хірург гатовы прызнаць сваю прафесійную бездапаможнасць?

Зрэшты, на свеце хапае прафесій, прадстаўнікі якіх могуць марыць пра ідэальнага спажыўца іх таленту.

Я памятаю повара з ашгабадскага «Grand Turkmen Hotel», дзе мне, удзельніку міжнароднага кніжнага кірмашу, давялося жыць цэлы тыдзень. Мне вельмі спадабаўся вячэрні плоў, і я сказаў повару, які назваўся Атамурадам, што хацеў бы, каб гэты смак зведала і мая жонка, таму ці не скажа ён мне рэцэпт яго прыгатавання.

Але Атамурад пакруціў галавой:

— Гэта агурджалінскі аш. Каб авалодаць усімі сакрэтамі яго прыгатавання, трэба быць туркменам не бліжэй чым у пятым калене. А каб адчуць яго сапраўдны смак, трэба нарадзіцца і вырасці там, дзе Сумбара ўпадае ў Атрэк.

— Чаму менавіта там? — спытаў я.

— Таму што адтуль мне прывозяць шафран і ажгон, якія дабаўляюцца ў агурджалінскі аш. Таму што там пасвяцца бараны, мяса якіх ідзе на агурджалінскі аш. Таму што я нарадзіўся там. Кожны раз, калі гатую агурджалінскі аш, я з пяшчотай і любоўю ўспамінаю свае родныя мясціны, і гэтыя любоў і пяшчота надаюць страве своеасаблівы прысмак, які адчуе толькі той, хто, як і я, нарадзіўся і вырас там, дзе Сумбара ўпадае ў Атрэк.

Атамурад марыў пра ідэальнага наведвальніка рэстарана «Grand Turkmen Hotel», які мог бы адчуць у яго стравах прысмак любові і пяшчоты, а я мару пра свайго ідэальнага чытача.

Напісаўшы некалькі старонак будучай кнігі, я люблю выйсці з кватэры і ў гарадскіх парках і скверах, на вуліцах і праспектах, у магазінах і кавярнях, у аўтобусах і метро назіраць за людзьмі, спрабуючы па тварах пазнаць таго, для каго, у першую чаргу, гэтая кніга пішацца. Таго, хто беспамылкова можа вызначыць, над якімі старонкамі я пакутаваў больш за ўсё, а ў якіх месцах рабіў паўзы ў часе працы, каб прагуляцца па горадзе.

Ідэальны чытач прызнае толькі арыгінал, а не пераклад, што значна звужае прастору ў маіх пошуках, а значыць, павялічвае шанцы знайсці яго. З іншага боку, гэтая прастора сёння ўжо занадта маленькая, каб у ёй мог абавязкова з'явіцца ідэальны чытач, і з кожным годам яна звужаецца ўсё больш.

Так, я пішу на мове, на якой паэзію і прозу чытае не вельмі шмат людзей.

Я ведаю, што сказаў бы на гэта Атамурад: «Чым часцей бачыш людзей з хот-догам у руках, тым смачнейшы аш мне хочацца прыгатаваць».

Я спытаў Атамурада, калі аднойчы мы сядзелі з ім на лавачцы ў скверы каля помніка паэту Караджааглану, ці думае ён пра тое, што ў яго папраўдзе не так і шмат шанцаў сустрэць у рэстаране таго, хто нарадзіўся і вырас там, дзе Сумбара ўпадае ў Атрэк, бо пераважная большасць пастаяльцаў «Grand Turkmen Hotel» — прыезджыя з іншых краін. На што Атамурад адказаў:

— У таго, хто чакае, чатыры пары вачэй, і ён адначасова глядзіць у чатыры бакі свету. У таго, хто перастае чакаць, няма ніводнай пары. Я рэдка размаўляю з наведвальнікамі рэстарана, таму не магу дакладна ведаць, ці быў сярод іх той, хто нарадзіўся і вырас у даліне Атрэка. Магчыма, ён быў учора, але быў вельмі галодны ці ў кепскім настроі. Галодныя, як і тыя, што садзяцца абедаць без настрою, не могуць адчуць сапраўдны смак ежы. А можа, ён сядзіць у рэстаране цяпер ці прыйдзе заўтра. Таму кожны раз я гатую аш для мінулага, для будучыні і для сённяшняга дня. Чаканне дапамагае трымаць сябе ў форме. Я баюся страціць сваю работу не з-за таго, што больш нічога не ўмею, а таму, што тады перастану чакаць.

Атамурад памаўчаў, нібы да драбніц узнаўляючы ў памяці адзін з эпізодаў свайго жыцця, а пасля прыгадаў, як пазнаёміўся з выдатным, па словах расказчыка, беларускім піяністам Валянцінам, які так і не дачакаўся сваёй славы на вялікай сцэне. У Ашгабад ён прыехаў разам з братам Андрэем, які тут служыў афіцэрам перад самым развалам Савецкага Саюза і ў якога тут засталася дачка Марына — яна выйшла замуж за туркмена. Кватэры Атамурада і Марыны раздзяляла адна сцяна, якая прапускала гукі так, як лісце дрэў прапускае сонечныя промні. Дзякуючы гэтаму ўрокі ігры на піяніна, якія па выхадных давала яе дачцэ сямідзесяцігадовая Вазіга (пра яе гаварылі, што яна пакладзе ў пусты кашалёк капейку, а дастане з яго рубель), даваліся яго сыну задарма.

Сам Атамурад хоць і любіў музыку настолькі, што не прапускаў ніводнай прэм'еры ў оперным тэатры, нотнай граматы цураўся, бо лічыў, што ў чалавека можа быць толькі адно прызванне. Гэта тая праца, пра якую думаеш увесь час, нават у сне; і як нельга ў адным казане адначасова гатаваць іштыкму і аш, так нельга адначасова думаць пра розную працу.

АДНОЙЧЫ вечарам Атамурад пачуў, як за сцяной нехта пачаў іграць на піяніна. Гэта была не суседчына дачка і не сямідзесяцігадовая Вазіга: ігралі не проста прафесійна, а віртуозна. Прычым гучаў фартэпіянны канцэрт Равэля для левай рукі. Апошняя акалічнасць асабліва зацікавіла Атамурада, паколькі таму, у каго дзве рукі і дзесяць пальцаў, іграць музыку, напісаную для адной рукі — такая ж кепская прыкмета, як здароваму на абедзве нагі хадзіць на мыліцах.

Атамурад усхапіўся з крэсла — і праз хвіліну ўжо стаяў перад Валянцінам. Калі яны знаёміліся, Атамурад, не адрываючыся, глядзеў яму ў вочы, але поціск рук выдаў, што ў Валянціна на правай руцэ не хапае безыменнага пальца.

Як чалавек, у якога ёсць сапраўднае прызванне, пра якое ён думае нават тады, калі гаворыць зусім пра іншае, Валянцін ва ўсім чуў музыку і на ўсё глядзеў вачыма музыканта. У апошні дзень перад вяртаннем у Мінск ён спёк вялікі бісквітны торт і папрасіў Марыну паклікаць на развітальную вячэру Атамурада. Торт меў выгляд размешчаных па спіралі клавіш піяніна — 52 клавішы былі белага і 36 — чырвонага колеру. Над апошняй — «до» пятай актавы — узвышаўся шакаладны скрыпічны ключ. Валянцін сказаў, што кожная з клавіш мае свой смак, як кожная клавіша ў сапраўднасці — свой гук. Каб адчуць сапраўдны смак торта, трэба лыжачкай зачэрпваць ад іх у той паслядоўнасці, у якой націскаюцца клавішы пры выкананні пэўнай мелодыі адной рукой. Розныя мелодыі надавалі торту сваю смакавую асаблівасць.

Калі Валянцін гэта расказаў прысутным, за сталом павісла маўчанне. Мала таго, што ніхто, апроч Валянціна і Марынінай дачкі, не ведаў нотнай граматы, кожны з прысутных не мог адважыцца першым лыжачкай браць агульны торт.

І тут з-за стала падхапілася Марына. Яна паласнула па бязгучных клавішах нажом.

Атамурад убачыў, як уздрыгнула правая рука Валянціна.

— А я прапаную… — звонка сказала Марына і замоўкла, не скончыўшы фразы: яе дачка ўсхапілася з-за стала і кінулася да дзвярэй.

— Што такое? — крыкнула ёй наўздагон Марына. — Дзядзька Валянцін пажартаваў! Якія ноты, якая мелодыя?!

Я спытаў у Атамурада, ці ведае ён, дзе цяпер Валянцін і чым займаецца.

— На жаль, я не ўпэўнены, што ён жыве шчасліва, каб пытацца пра яго ў Марыны, — сказаў Атамурад. — Людзі самі расказваюць пра сваю радню, калі ў тых усё добра, і стараюцца абысці гэтую тэму, калі ўсё кепска. Валянцін называў сябе музыкантам, у якога мінулага больш, чым цяперашняга, таму я не ведаю, дзе і кім ён цяпер працуе, але калі ў мяне спытаць, хто такі Валянцін з Беларусі, я, не раздумваючы, адкажу: у першую чаргу — выдатны піяніст, а ўсё астатняе не мае вялікага значэння.

Я паглядзеў на рукі Атамурада, якія нагадвалі рукі дваццацігадовага юнака.

— Можа, ён стаў добрым поварам?

— У яго торце залішне шмат музыкі, — з усмешкай пакруціў галавой Атамурад. — А гэта тое ж самае, калі ў агурджалінскі аш дадаць залішне шмат перцу.

ПЕРАВАЖНАЯ большасць пісьменнікаў мараць пра свайго масавага чытача, і толькі нямногія мараць пра чытача ідэальнага, цудоўна разумеючы, што ідэальных (гэта значыць, таленавітых чытачоў) не нашмат больш, чым таленавітых пісьменнікаў. На жаль, вельмі часта адшукаць аднаго чалавека цяжэй, чым знайсці тысячы людзей. Ці быў такі чытач у Купалы — той, хто, прачытаўшы ў 1925 годзе яго радкі:

Мне бацькаўшчынай цэлы свет,
Ад родных ніў я адвярнуўся…
Адно… не збыў яшчэ ўсіх бед,
Мне сняцца сны аб Беларусі,
прадчуваў (як і сам аўтар, калі пісаў іх), што паэта чакае ранняя смерць?

Ідэальнае чытанне нагадвае сапраўднае каханне: пры ім позірк бегае па словах, нібы па целе, і раней, чым пранікнуць углыб тэкста, каб атрымаць ад гэтага найвышэйшую асалоду, ён атрымлівае асалоду ад сузірання таго, як пабудаваны фразы і падзелены тэкст на абзацы.

З гэтага няцяжка здагадацца, што ідэальнае чытанне, як і каханне, можа з'явіцца не адразу, не з першага знаёмства з тэкстам, а ідэальны чытач з часам можа астыць да свайго любімага аўтара і захапіцца іншым.

Нарэшце, што таксама вельмі важна, каб мець свайго ідэальнага чытача, неабавязкова трэба быць геніяльным пісьменнікам, таму што любоў да творчасці канкрэтнага аўтара часам бывае такая ж невытлумачальная і непрадказальная, як і каханне. Праўда, трэба прызнаць, што многія, калі бяруць у рукі новую кнігу, спачатку звяртаюць увагу на яркую вокладку, а не на імя аўтара, якое яны хутка забудуць, паколькі чытанне для іх — магчымасць пазбавіцца ад лішніх хвілін, як ад дробных купюр, што абцяжарваюць кашалёк і з-за чаго яны купляюць зусім не патрэбныя рэчы. Так які-небудзь юнак з неўтаймоўнай плоццю ў першую чаргу звяртае ўвагу на дзявочыя формы, а імя дзяўчыны, патрэбнай яму на адну ноч, можа забыць вельмі хутка.

Часта, гуляючы па горадзе, я перабіраю ў памяці словы, нібы гальку для мазаікі: я падбіраю іх адно да аднаго і складаю ў фразы, каб пасля ўкласці іх у вусны сваіх герояў. Бывае, слоў аж зашмат; бывае, наадварот, іх не хапае; але і ў першым, і ў другім выпадку далёка не кожны раз удаецца скласці фразы, якія пасля зноў не рассыпаліся б у асобныя словы — так, як гэта заўсёды бывае з банальнымі фразамі.

Аднойчы, праз тры гады пасля паездкі ў Ашгабад, падчас такіх прагулак я адчуў, што ўва мне гучаць не словы, а музыка, і фразы для маіх герояў ператвараюцца ў ноты. Я ўспомніў мелодыю: гэта быў канцэрт рэ мажор Равэля для левай рукі, напісаны ім за некалькі гадоў да таго, як ён перастаў пазнаваць уласную музыку. У мяне ёсць запіс гэтага канцэрта ў выкананні Паўля Вітгенштэйна і Каралеўскага аркестра Канцэртгебаў, але ў гэтым выпадку гучаў адзін раяль. І я здагадаўся, што гэта іграў Валянцін, якога я ніколі не бачыў.

Толькі цяпер я зразумеў, што апошнія тры гады не проста не забываў пра Валянціна, але падсвядома хацеў сустрэцца з ім. Чаму ж толькі цяпер я ўсвядоміў гэта? Напэўна, таму, што ўсе гады пасля паездкі ў Ашгабад я думаў так, як думаў Атамурад: забіваючы ў чалавеку мару, немагчыма не патрапіць у сэрца. І тады можна здагадацца, чаго баяўся Валянцін.

У гісторыі музыкі шырока вядома імя аўстрыйскага піяніста Паўля Вітгенштэйна. Зайздроснікі казалі, яго пальцы зараджаны такой энергетыкай, што падчас ігры на фартэпіяна яны не кранаюцца клавіш, і ў гэтым сакрэт яго віртуознай ігры, але тут не абышлося без дапамогі д'ябла. У якасці аргумента яны прыводзілі той факт, што пасля таго, як Вітгенштэйн на Першай сусветнай вайне страціў правую руку, адной левай ён іграў лепш, чым дагэтуль абедзьвюма, а левая рука, як вядома, лічыцца нячыстай, і тое, што робіцца ёй, робіцца з дапамогай д'ябла.

Вітгенштэйн, несумненна, быў лепшым з усіх вядомых у гісторыі музыкі аднарукіх піяністаў, але не першым, бо першым быў венгерскі граф Геза Зічы, які ў 1863 годзе падлеткам страціў на паляванні правую руку, але праз гэта не страціў жадання стаць вядомым піяністам, амаль пяць гадоў браў урокі ў Франца Ліста і пасля выступаў з ім на пару, пераклаўшы лістаўскі «Ракоцы-марш» для выканання ў тры рукі. Галоўнае, чаго дамагаўся Ліст ад свайго вучня, — трэба слухаць не раяль, а ўласную душу, бо не раяль павінен нараджаць гукі, а душа піяніста. І праўда, як сведчылі сучаснікі Ліста, калі на сцэне стаялі толькі два раялі, за якімі былі ён і Зічы, здавалася, што іграе цэлы аркестр.

Але Зічы не ўмеў таго, што ўмеў Вітгенштэйн, і гэта не дазволіла венгру стаць лепшым аднарукім піяністам свету. Калі ён пачынаў іграць, гледачы заўсёды ўражваліся тым, як віртуозна ён іграе адной рукой. Калі пачынаў іграць Вітгенштэйн, гледачы ператвараліся ў слухачоў і забывалі, што ў яго толькі адна рука.

Магчыма, аднойчы, думаў я, гуляючы па горадзе і неўсвядомлена кідаючы позірк спачатку на рукі прахожых, а пасля на іх твары, Валянцін ведаў пра ўсё гэта і баяўся, што ў наш прагматычны і цынічны век размовы пра яго пакалечаную руку заўсёды будуць ісці папарадзе размоў пра яго ігру, а спагада да яго заўсёды будзе знаходзіцца папарадзе захаплення.

Зрэшты, а чаму б за гэтыя гады, якія ў нашым жыцці шмат што змянілі, ён не мог заняцца бізнесам? Ды і мала кім ён мог стаць сёння ў свеце, дзе больш за ўсё цэніцца ўменне зарабіць грошы, а значыць, верагоднасць сустрэцца з ім у мяне такая ж, як верагоднасць таго, што верабей, які зараз сядзіць на гарадскім ліхтары, на ляту зловіць дзюбай дажджавую кроплю. Гэта можа здарыцца праз імгненне, а можа не здарыцца ніколі.

А ўвогуле, думаў я далей, пераступіўшы парог сваёй кватэры і раскрываючы парасон, каб хутчэй высах, — а ўвогуле, якая мне справа да нейкага Валянціна, якога я ніколі не бачыў, ніколі не чуў, як ён іграе, і хто ведае, ці яшчэ спадабалася б мне яго ігра, як, зрэшты, і ён сам.

Я падышоў да кніжнай шафы і паглядзеў на паставленыя ў рад чатыры кнігі Міларада Павіча. Калісьці мне захоплена расказала пра яго знаёмая журналістка, якая ва ўрадавай газеце вядзе калонку міні-аглядаў новых кніг і, трэба сказаць, робіць сваю справу віртуозна, хоць гэта не абавязвае мяне пагаджацца з тымі ацэнкамі, якія яна дае чарговай навінцы. Таму, пачуўшы з яе вуснаў хвалебныя словы на адрас Павіча, я не кінуўся тут жа ў бліжэйшую кнігарню, а толькі шматзначна ўсміхнуўся. Зразумела, гэтае імя я чуў і да яе, ведаў, што Павіч у найноўшай літаратуры лічыцца адным з галоўных міфатворцаў і што ён прыдумаў у ёй новы напрамак: нелінейную прозу. Але да розных постмадэрнісцкіх штучак я стаўлюся насцярожана і надта добра ведаю сілу рэкламы, таму, шматзначна ўсміхнуўшыся, я прапанаваў сваёй знаёмай:

— Паўтары якую-небудзь фразу, прыдуманую ім.

Яна прымружыла вочы, нібы не хацела, каб гэтую фразу я прачытаў у яе вачах раней, чым яна яе прамовіць, і праз некалькі секундаў сказала:

— «Час, як мяту, можна пасеяць, і ён прарасце».

У той жа дзень я купіў чатыры кнігі Павіча, не разгортваючы, паставіў іх у рад у кніжную шафу і прамармытаў самому сабе: «Час, як мяту, можна пасеяць, і ён прарасце». Для чытання добрай кнігі трэба падбіраць адпаведны момант, сугучны твайму стану душы, і я зразумеў, што гэты момант для мяне яшчэ не прыйшоў. Тым не менш, у кампаніях знаёмых літаратараў я пачаў упэўнена гаварыць: «Павіч, несумненна, адзін з самых яркіх празаікаў дваццаць першага стагоддзя», і прыгадваў яго фразу, якую калісьці пачуў з вуснаў аглядальніцы ўрадавай газеты. Гэтая фраза часта ажывала ў маёй памяці, і кожны раз яна мне здавалася не такой, як раней, таму кожны раз з яе можна было пачынаць новы сюжэт. Я падумаў, што паступова станаўлюся ідэальным чытачом Міларада Павіча, пры тым, што пакуль не прачытаў ніводнай яго кнігі. Я ўсё адмаўляў сабе ў гэтым задавальненні, каб як след згаладацца па ім, пакуль аднойчы не зразумеў, што ўжо баюся брацца за яго, паколькі баюся ў ім расчаравацца, таму што той Павіч, які склаўся ў маім уяўленні, насамрэч можа аказацца зусім іншым, не маім, няхай сабе і тройчы таленавітым.

Ці не так я баяўся расчаравацца і ў Валянціне?

АДНАГО разу пасля душнай ліпеньскай ночы, калі здаецца, што падушка можа апячы шчаку, мяне разбудзіў мабільнік.

— Прывітанне! Можаш гаварыць?

Гаварыць? Здавалася, я адно хвіліну назад нарэшце заснуў, таму тое, што мне хочацца зараз сказаць, таму, хто чакае ад мяне адказу, лепей не ведаць. Але гаварыць, тым больш жанчыне, у большасці выпадкаў трэба тое, што яна хоча пачуць ад цябе.

— Ты на працы?

Якога д'ябла мне рабіць на працы ў першы дзень свайго адпачынку?!

— Ой, прабач! Я хачу сёння запрасіць цябе на абедзенны прамы эфір.

Ясна. На прамы радыёэфір дамаўляюцца загадзя, хаця б за некалькі дзён. Значыць, нехта паабяцаў, але не змог. Я сам 14 гадоў працаваў на радыё, ведаю, што адчувае аўтар праграмы ў такіх выпадках, таму адразу прыкідваю, у колькі мне трэба выехаць з дому. Гадзіны за паўтары — каб не спазніцца. Аднак насамрэч выходжу за дзве, на станцыі «Плошча Леніна» падымаюся з метро, каб прайсціся пешшу па праспекце Незалежнасці да Дома радыё. Мне трэба настроіцца на радыёразмову.

Я іду па праспекце насупраць цёплай плыні сонечных промняў. Я кідаю позірк на незнаёмых мне людзей, на хвіліну пакідаю іх у памяці і ўяўляю сваімі слухачамі. Я думаю, што ім сказаць.

Шмат гадоў таму, калі я вучыўся на філфаку БДУ, мой сябар і аднакурснік Міраслаў раіў мне, як здаваць экзамены па літаратуры: калі табе выпаў нешчаслівы білет, старайся пераключыцца на тое, што добра ведаеш, і ўцягнуць выкладчыка ў дыялог.

На экзамене па класічнай рускай літаратуры мне трапіўся Дастаеўскі. Не сказаць, каб я кепска ведаў яго творчасць, але гэта быў любімы пісьменнік майго экзаменатара. А ў дачыненні да сваіх любімых часта праяўляюць рэўнасць, якая, у гэтым выпадку, магла паўплываць на маю адзнаку, паколькі раўніўцам дагадзіць вельмі цяжка. Таму я не стаў рызыкаваць і спачатку выказаў захапленне раманамі Фёдара Міхайлавіча, пры гэтым падкрэсліўшы, што нашы адносіны да яго — пытанне найперш духоўнага, а не эстэтычнага характару. А ўвогуле, працягваў я, калі вырашыў, што самы час пачаць аддаляцца ад Дастаеўскага, найбольшае ўзбагачэнне ад чытання літаратурных твораў мы атрымліваем не праз веды, а праз веру. Духоўны пачатак у мастацкім слове — самы магутны, таму яно напаўняе нас найперш верай, а не ведамі. А вера, у адрозненне ад навукі, таго ж літаратуразнаўства, зближае розныя па сваім маштабе велічыні, паказваючы іх адрозненні ў той плоскасці, у якой навука паказаць не ў стане. Таму, з пункту гледжання духоўнага ўспрымання, мы можам сказаць, паказваючы рознасць паміж імі: Пушкін — для ўсіх, а Лермантаў — для кожнага.

Пасля гэтых слоў выкладчык, які ўвесь час, пакуль я гаварыў, глядзеў у мой білет, быццам звяраў тое, што я расказваю, з тым, што там напісана, рэзка падняў галаву, нашы позіркі сустрэліся, і за некалькі імгненняў да таго, як ён сказаў, што ставіць мне «выдатна», гэтае рашэнне я прачытаў у яго вачах.

ПАЗНЕЙ я не раз карыстаўся парадай свайго сябра Міраслава ў самых розных сітуацыях, як, напрыклад, у цяперашняй: я не ведаю, пра што ў мяне будуць пытацца радыёслухачы, але я ўпэўнены, што абавязкова раскажу ім гісторыю пра Валянціна.

Я падымаюся на другі паверх Дома радыё за 40 хвілін да пачатку эфіру. На сэрцы лёгка, быццам замест яго паветраны шарык. Я ведаю, чаму: ёсць шанц, што на гэтую перадачу адгукнецца нехта, хто ведае Валянціна. А можа (хоць наўрад ці, вядома), ён сам.

Я спыняюся каля дзвярэй з таблічкай «Кіраўнік літаратурна-музычных праектаў Таццяна Якушэвіч». У яе кабінеце з правага боку ля сцяны стаіць піяніна «Беларусь»; стаіць яшчэ з таго часу, калі мы не ведалі ні камп'ютараў, ні інтэрнэту, і кампазітары прыходзілі на радыё не з CD ці флэшкамі, а з нотнымі лістамі, і, сеўшы за гэтае піяніна, паказвалі музычнаму рэдактару свае новыя песні. Вечка адкінута, і мне здаецца, што ў паветры яшчэ можна злавіць апошнія гукі мелодыі, якую тут нядаўна ігралі.

— Скажы, калі ласка, — пытаюся я ў Таццяны і пры гэтым уважліва гляджу на клавішы піяніна, — ці магчыма спячы торт у выглядзе клавіш?

Таццяна здзіўлена і, як мне здаецца, насцярожана глядзіць на мяне. Я думаю, яна баіцца, што я незадаволены сваім вымушаным з'яўленнем на радыё ў час адпачынку, таму магу несці ў эфіры ўсялякую лухту, і расказваю ёй пра Валянціна. Яна слухае, але відаць, што ў гэты ж час думае пра нешта сваё. Яе вочы глядзяць міма мяне. Мне здаецца, яна думае, што ўсю гэтую гісторыю я выдумаў па дарозе на радыё. Калі так, я не буду расказваць у эфіры пра Валянціна.

Нарэшце нашы позіркі сустракаюцца, і Таццяна гаворыць:

— Ведаеш, Валянцін — гэта мой брат.

Я сядзеў у невялікім, чатыры на шэсць, пакоі, дзе ў кожнай рэчы жыла музыка. Яна не знікала назусім, калі змаўкаў раяль, як не знікае назусім нішто і ніколі, а пераходзіла ў іншы стан, няўлоўны для слыху. Прысутнасць музыкі адчувалася хутчэй фізічна, варта было дакрануцца да стала, да нотных аркушаў на ім. Яна не знікала назусім, таму ўсё больш назапашвалася тут з гадамі, і цяпер ужо любыя гукі ў пакоі здаваліся музыкай.

Я сядзеў у шырокім скураным крэсле насупраць акна, і твар Валянціна то цямнеў, калі ён паварочваўся да мяне, то святлеў, калі схіляўся над раялем і левай рукой лёгка, нібы гладзячы, праводзіў па клавішах. Гэта быў так званы кабінетны раяль знакамітай нямецкай фірмы August Förster, якая славілася чысцінёй гукаў сваёй прадукцыі. Мне не трэба было расказваць Валянціну ўсю перадгісторыю нашай сустрэчы. Колькі дзён таму за мяне гэта зрабіла Таццяна. Праўда, не ведаю, наколькі яе пераказ адпавядаў праўдзе: адны і тыя ж словы, прамоўленыя рознымі людзьмі, часам нясуць розную інфармацыю.

— Ёсць людзі, перад якімі самаўпэўненасць раскрывае новыя вяршыні, а ёсць тыя, каго яна заводзіць у тупік. Мне здаецца, я своечасова разгледзеў гэты тупік напярэдзе сваёй дарогі, каб яшчэ мог звярнуць на іншую, — Валянцін кіўнуў у бок сінтэзатара Casio на высокіх ножках, які стаяў побач з раялем. — Я стаў аранжыроўшчыкам, і на хлеб мне хапае. І справа не ў гэтым, — ён прыўзняў з клавіш і тут жа апусціў на іх правую руку, на што яны адазваліся жаласным ля. — Проста я не выдатны піяніст па сваёй прыродзе.

— Ты мог бы стаць лепшым беларускім піяністам, але стаў лепшым аранжыроўшчыкам, — Таццяна прынесла мне кубачак кавы і паставіла на столік з чорнага шкла, побач з крэслам, а сама зноў выйшла з пакоя, верагодна, каб не перашкаджаць нам.

— Атамурад — цудоўны слухач з выдатным прыроджаным слыхам! Дзякуючы сваёй суседцы Вазізе ён някепска засвоіў тэорыю музыкі і пры гэтым не развучыўся слухаць сэрцам, а не розумам. Аднак ён не ведаў аднаго сакрэта маёй ігры.

Валянцін сказаў гэтыя словы з усмешкай, нібы жартам, але я быў перакананы, што зараз пачую нешта важнае для сябе.

— Я ляўшун. А леўшуну канцэрт для левай рукі іграць значна прасцей. Вось і ўсё.

Прызнанне Валянціна для мяне было поўнай нечаканасцю.

— Скажыце, вы чулі пра тое, што для ляўшэй характэрна так званае адначасова-візуальнае мысленне, у той час як у праўшэй пераважае мысленне лінейна-паслядоўнае? Напрыклад, праўша бярэ ў рукі раман, чытае першы сказ, аналізуе яго, пасля чытае наступны, аналізуе. Сказы, як пацеркі, па чарзе нанізваюцца на нітку сюжэту, і праўша, пакуль не адкладзе альбо не закончыць чытанне, на кожным этапе трымае ў свядомасці толькі тую мізэрную частку рамана, на якую скіраваны яго позірк. Так той, хто робіць каралі, захоплены працай, трымае позіркам толькі тыя пацеркі, якія ў гэты момант нанізвае на нітку. Ляўша адначасова і чытае, і аналізуе раман. Для яго раман — гэта не каралі, а… ну, скажам, навагодняя ёлка, якую яму, з падказкамі аўтара, вядома, трэба ўпрыгожыць сказамі-цацкамі. На кожным этапе ён бачыць і ацэньвае яе ўсю, яго думкі ідуць не строга следам за развіццём дзеяння рамана. Яны то вяртаюцца назад, на папярэднія старонкі, то спрабуюць спрагназаваць тое, што можа адбывацца ў рамане далей. Мне здаецца, ідэальны чытач абавязкова мусіць быць ляўшой.

Я зрабіў кароткую паўзу, каб пераканацца, што мае словы ў гаспадара кватэры не выклікаюць іроніі. Мне хацелася, каб Валянцін спрачаўся ці пагаджаўся са мной, але ён моўчкі, з ледзь прыкметнай усмешкай глядзеў у падлогу і рытмічна ківаў галавой, нібы ў такт мелодыі, якая гучала ў ім.

— Не мне вам расказваць, што піяніст-праўша і піяніст-ляўша тэхнічна аднолькава добра спрацьляюцца з самымі складанымі творамі, напрыклад, транскрыпцыямі Ліста. Пры ўмове, вядома, што яны абодва аднолькава добра падрыхтаваныя, — на ўсялякі выпадак удакладніў я. — Але падчас ігры праўша сваімі думкамі толькі дублюе рухі пальцаў рук у той паслядоўнасці, у якой ад іх гэтага патрабуе клавір. Таму ён чуе тое, што ў гэты момант выдаюць клавішы раяля — ні больш і не менш. А ляўша чуе твор цалкам, адразу ў трох вымярэннях — у мінулым, у цяперашнім і ў будучым, і гэта робіць яго ігру больш арыгінальнай, віртуознай, і кожны раз яна ў яго выкананні гучыць па-іншаму. Што тычыцца вас — тут яшчэ больш цікавы і рэдкі выпадак, які ўносіць непаўторнасць у вашу ігру, у ваш талент, разумееце? Мы не гаворым пра опернага спевака: у яго таленавіты голас. Мы гаворым: таленавіты оперны спявак. Таму што талент не ў голасе. Талент творцы — у яго душы, пра якую мы за мільёны гадоў свайго існавання так нічога і не даведаліся. Можна толькі сказаць, што яна запаўняе ўсё наша цела, як кроў запаўняе жылы, і востра рэагуе на ўсе яго праблемы. Таму Ван Гог да таго, як адрэзаў сабе мочку вуха, і Ван Гог пасля таго — у пэўным сэнсе розныя мастакі. Як ёсць два Бетховены — той, у якога нармальны слых, і той, які слых страціў. Прычым другі Бетховен стварыў больш славутыя творы, чым першы. Як, дарэчы, і Ван Гог. Але я прыйшоў не дзеля таго, каб пачуць вашу, не сумняваюся, цудоўную ігру. Напэўна, правільней сказаць: дзеля таго, каб перастаць чуць яе. З таго часу, як мне расказаў пра вас Атамурад, яна часта гучыць у маім уяўленні: Равэль, Брамс, Пракоф'еў — тая, што кампазітары пісалі для левай рукі. Прычым гучыць у самыя непадыходзячыя моманты: калі я саджуся за стол і пачынаю працаваць над сваёй новай кнігай. Яна стала замінаць маім думкам, і я зразумеў: каб музыка перастала гучаць, мне трэба паснаёміцца з вамі…

Калі я падняўся з крэсла, каб развітацца, было ўжо позна.

НЕ ведаю, чаму, але ў той момант я быў перакананы, што наша з Валянцінам сустрэча — першая і апошняя. А галоўнае, мне чамусьці гэтага хацелася. Ён стаяў перада мной крыху зніякавелы, але ўсё з той жа нязменнай, ледзь прыкметнай усмешкай на вуснах, значна ніжэйшы, чым я яго ўяўляў, у шэрых пантофлях на босую нагу, а я глядзеў на яго з учарашняга дня няголены твар, на якім няроўна расло рудое шчацінне, і думаў пра тое, што бачу іншага Валянціна, не таго, якога памятаў Атамурад. Гэта быў чалавек, у якога ад свайго мінулага засталіся адны счарсцвелыя крошкі, і яму хацелася змахнуць іх з памяці, як са стала.

Заставалася апошняе, што мне хацелася даведацца ад Валянціна.

— Скажыце, як вам прыйшла ў галаву ідэя спячы торт у выглядзе клавіш раяля?

Валянцін, здавалася, быў рады пытанню.

— Гэта не зусім мая ідэя. Ёсць такі вядомы на ўвесь свет італьянскі шэф-повар Антоніа Карлучы. Ён выдаў кнігу «Паста і опера», дзе апісаў сямнаццаць рэцэптаў страў, да яе прыкладаецца дыск з сямнаццаццю славутымі італьянскімі операмі. Карлучы рэкамендуе канкрэтныя стравы гатаваць і есці пад канкрэтную оперу, толькі тады яны набываюць незвычайны смак.

Таццяна праводзіла мяне да аўтобуснага прыпынку.

— Ну як? — спытала яна.

— Дзякуй за знаёмства з братам, — сказаў я. — Ён праўда шмат аранжыруе?

— Так. Апошнім часам яму нават паступаюць заказы з Масквы.

— О, гэта вялікія грошы!

Я чуў, што «для Масквы» імкнуцца працаваць многія нашы маладыя музыканты, але ў тамтэйшым шоу-бізнесе ўсё куплена і падзелена на сферы ўплыву, таму прабіцца туды камусьці збоку амаль немагчыма.

— Дарэчы, ён аранжыраваў «Вольную птушку».

Я не дужа люблю сучасную папулярную музыку, але гэтая песня не выходзіла з маёй галавы ўсю дарогу пасля развітання з Таццянай. Справа ў тым, што песня «Вольная птушка», якая апошнія месяцы штодня гучыць на ўсіх беларускіх FM-станцыях, была напісана на мае словы.

■ Прыёмная кампанія-2014

У АБІТУРЫЕНТАЎ УЖО 68 СТАБАЛЬНЫХ СЕРТЫФІКАТАЎ

28 чэрвеня ў Беларусі фінішуе цэнтралізаванае тэсціраванне, і абітурыентам застаецца толькі дачакацца вынікаў здачы тэстаў. Тым часам па некаторых прадметах арганізатары ЦТ ужо праверылі работы ўдзельнікаў экзамену.

Вядома, што стабальныя сертыфікаты атрымаюць у гэтым годзе 15 удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове і 25 абітурыентаў, якія здавалі на ЦТ рускую мову. Варта нагадаць, што разрыў паміж колькасцю тых, хто выбірае рускую і беларускую мову на цэнтралізаваным тэсціраванні, пастаянна расце: сёлета ён склаў больш за 50 тысяч чалавек. Тым не менш, беларускую мову абітурыенты здалі лепш.

Не змаглі пераадолець устаноўлены парог у 10 балаў на ЦТ па беларускай мове 2069 чалавек. Пры гэтым двое абітурыентаў умудрыліся ўвогуле атрымаць нуль балаў. На рускай мове менш чым 10 балаў набралі 8319 чалавек, а з нулявым вынікам прыйшлі на фініш 17 абітурыентаў.

Па выніках ЦТ па грамадазнаўстве 100 балаў набралі 25 чалавек, а нуль балаў — 7 чалавек. Мінімальны парог на ЦТ па грамадазнаўстве складае 20 балаў: 648 удзельнікаў экзамену набралі менш за гэтую суму.

Біялогію бліскуча здалі толькі 3 абітурыенты, а 2 абітурыенты атрымалі 0 балаў. На біялогіі для таго, каб быць дапушчаным да ўдзелу ў конкурсе, трэба было набраць не менш як 15 балаў. 994 абітурыенты не змаглі гэта зрабіць.

А тым часам у ВНУ распачалася перарэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень. Перарэгістрацыя завяршаецца 1 ліпеня!

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Дзённік настаўніка

А РАЗАМ УСЁ Ж ЛЕПШ…

Не ведаю нават, навошта я бяруся за гэтую тэму? Раздзельнага навучання хлопчыкаў і дзяўчынак у нашай краіне няма і нават не прадбачыцца. Але вось прачытаў нядаўна ў інтэрнэце, што, маўляў, з'явіліся ў Расіі (у горадзе Каменск-Уральскі, калі дакладней) раздзельныя класы (не школы, а толькі класы). Настаўнікі патлумачылі такое сваё рашэнне пажаданнямі бацькоў і яшчэ тым, што падыходы да навучання хлопчыкаў і дзяўчынак павінны адрознівацца…

Прачытаў і задумаўся…

А сапраўды, добра гэта ці дрэнна — раздзельнае навучанне? Бо было ж такое калісьці, у дарэвалюцыйнай Расіі… І ці не вяртанне гэта да мінулага ў педагагічным эксперыменце Каменск-Уральска?

Але ж гэта не зусім так, а дакладней, зусім не так! Бо на Урале раздзельнымі зрабілі першыя класы, а ў той, ранейшай Рас

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 18 (235)

■ Імпрэза

«ВІТАЎТ» ЯК ПАЧАТАК

Фестываль «Балетнае лета ў Вялікім» — новы тэатральны праект, які адкрыецца сёлета творам на нацыянальную тэматыку. 29 чэрвеня гэты твор — прэм'еру мінулага сезона — можна будзе ўбачыць перад летнім тэатральным зацішшам. Балет «Вітаўт» створаны кампазітарам Вячаславам Кузняцовым паводле лібрэта Аляксея Дударава. Пастаноўку ажыццявіў народны артыст Беларусі Юрый Траян. З чаго яшчэ пачынаць новы тэатральны праект у Беларусі, калі не з размовы пра нацыянальную гісторыю?

Якая размова, скажаце вы, — балет жа?.. Не, дзівіцца не варта: харэаграфія — сур'ёзнае мастацтва, якое гаворыць, аналізуе і адлюстроўвае з'явы жыцця, толькі галоўнымі выяўленчымі сродкамі становяцца самі артысты, пластыка іх цела. Зразумець, у чым асаблівасць гэтага віду мастацтва, якраз можна будзе дзякуючы праграме, якая працягнецца да 9 ліпеня. Складаецца яна як з класічных пастановак, так і з сучасных балетаў. Бо як жа без «Лебядзінага возера», тым больш калі галоўныя партыі будуць танцаваць салістка Вялікага тэатра Расіі Крысціна Крэтава і саліст Марыінскага тэатра Ігар Колб (дарэчы, выхаванец беларускай харэаграфічнай школы)? Яшчэ адзін зорны класічны спектакль — «Дон Кіхот» Мінкуса — дасць магчымасць пабачыць салістаў Вялікага тэатра Расіі Чынару Алізадэ і Міхаіла Лабухіна.

Айчынны глядач можа чакаць сустрэчы з Тбіліскім тэатрам оперы і балета імя Паліяшвілі: на гэты раз да нас прывязуць спектакль «Паўшыя анёлы», які выконваецца пад барабанны дробат і пастаноўку «Маленькая смерць» вядомага ўжо ў Беларусі харэографа Іржы Кіліяна. Фактычна сёлета ў рамках «балетнага лета» нас чакаюць гастролі Грузінскага балета, таму што да нас прывязуць шэраг цікавых пастановак, напрыклад, яшчэ «Таямнічы сад» у харэаграфіі С. Яўцімава і абсалютна грузінскі па духу «Сагалабелі», створаны паводле народных мелодый (харэаграфія Ю. Посахава). Але які грузінскі балет без прымы Ніны Ананіяшвілі? Легендарная балерына мала таго, што будзе танцаваць сама, дык яшчэ і ў пары з народным артыстам Беларусі Ігарам Артамонавым — у спектаклі «Маргарыта і Арман» (на музыку Ф. Ліста ў пастаноўцы Ф. Эштана).

Беларускі балет прадставіць усё лепшае, што ёсць у афішы тэатра, з акцэнтам на новыя пастаноўкі, якія будуць аб'яднаны ў тэматычныя вечары: «Вечар харэаграфіі Джорджа Баланчына», дзе пакажуць шэраг новых невялікіх спектакляў, што маюць дачыненне да гісторыі балета. І калі пра гісторыю, то адной з яе персон-наватараў у свеце стаў Іржы Кіліян, якому таксама прысвячаецца асобны вечар.

Але аматары балета (якія звычайна і самі сочаць за прэм'ерамі) найбольш будуць чакаць гала-канцэрта «зорак» сусветнага балета напрыканцы ўсёй імпрэзы, дзе выступяць артысты з Беларусі (а ў нас тут «зорак» багата), Расіі, Грузіі, Германіі, Даніі, Польшчы.

Ларыса ЦІМОШЫК

ВОКА МАСТАКА

Вядомаму беларускаму празаіку і мастаку, журналісту, ветэрану «Звязды» Віктару Карамазаву — 80 гадоў



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У літаратуры адной з вызначальных характарыстык вартасцяў мастацкага твора з'яўляецца прысутнасць душы паэта ці празаіка — адным словам, душы аўтара. Гэта тое, што цяжка разгледзець было асабліва крытыцы, якая шукала ідэйны змест твора, тлумачыла чытачу і яшчэ невядома каму, чаму тая ці іншая аповесць мае права займаць нашу ўвагу, а іншы раман ці іншы верш пазбаўлены ідэйнасці.

Вось і я мераю мастацкую літаратуру на ступень прысутнасці ў ёй душы, душэўных трывог і сумненняў, а часам — і душэўнай трываласці. Мяне абсалютна, прабачце за маю «апалітычнасць», не цікавіць, ці звярнуўся пісьменнік да сучаснасці, надзённасці па змесце твора, па выбары герояў і падзей, пра якія ён піша. Для мяне галоўная прысутнасць сучаснасці ў іншым: у поглядах, ацэнках пісьменнікам самага рознага матэрыялу.

Таму з піетэтам і павагай стаўлюся да выпакутаваных, сабраных у няпростым мастацкім пошуку слоў, вобразаў, сімвалаў Канстанціна Паўстоўскага, Юрыя Казакова, Юрыя Трыфанава, Юрыя Нагібіна, Веніяміна Каверына, Аляксандра Твардоўскага, Віталя Сёміна... Такімі ж прывабнымі ў беларускай літаратуры для мяне з'яўляюцца празаікі і паэты Янка Брыль, Аркадзь Куляшоў, Ян Скрыган, Пімен Панчанка, Міхась Стральцоў, Анатоль Кудравец, Алесь Жук... І ў іх шэрагу — Віктар Карамазаў.

Яго, здавалася б, розныя кнігі вельмі падобныя. І першыя («Падранак (1968), «Па талым снезе» (1973), «Спіраль»), і наступныя, што прыйшлі да чытача крыху пазней. Падобныя з яго раманамі, аповесцямі — «Пушча», «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «Дзень Барыса і Глеба», «Антон»... Ёсць у гэтых творах жывы адбітак жыцця, нават тады, калі пісьменнік піша пра мастакоў, жывапісцаў. Але чаму «нават»? Хіба мастак, жывапісец, нават скульптар прыходзіць да пэўнай ідэі, не дбаючы пра сучаснасць? Хіба мастак не бачыць надзённае, не імкнецца асэнсаваць будзённую мітусню?..

Малюючы рэчаіснасць, Віктар Карамазаў спрабуе словамі-фарбамі выпісваць светапогляд папярэднікаў, дадае да іх светабачання ўласную ацэнку свайго часу. А самае галоўнае — ва ўсім матэрыяле, які становіцца прадметам творчых пакут і асэнсаванняў, дбае пра чалавека і чалавечнасць. І гэта не можа не прыцягваць, не можа не ўзрушваць. Слоўцы, словы, сказы (а найперш — вобразы і думкі) становяцца жыццядайнай матэрыяй, сягаюць ад душы аўтара да душ і сэрцаў чытача. Крынічнай вадой абуджаюць нашу свядомасць.

У апошнія дзесяць гадоў я захапіўся чытаннем прозы Віктара Карамазава, прысвечанай жывапісцам, беларускім мастакам розных пакаленняў. Гэтыя творы адкрылі перада мной новы свет, прымусілі па-новаму ўвогуле агледзець багатую прастору беларускай культуры, параднёнай з мастацтвам і культурай суседзяў, усяго свету. І парадаваўся апошнім па часе напісання навелам Віктара Карамазава, якія надрукаваны ў шостым нумары часопіса «Полымя»: «Каралеўскія пацеркі», «Сэрца рыцара, вока снайпера», «Застаўся тачыльшчык», «Што нас яднае». У адной з іх прачытаў цытаванае Віктарам Філімонавічам з дзённіка Яўгена Красоўскага: «Жывапіс — мастацтва цяжкое і для гледача, і для мастака. Адразу не разгледзіш глыбока схаванае гармоніі, пластыкі, колеру з формай, са зместам. Толькі вопытны мастак бачыць глыбінную красу жыцця, прыроды, чалавека, іх малюнак, формы, фарбы ў еднасці. Гэтае бачанне і ёсць багацце, шчасце мастака. Яно даецца самой прыродаю і як дар Гасподні, дар найвышэйшы. І таму, калі мастак валодае ім, яму не трэба ні славы, ні матэрыяльнага багацця. Большага багацця ў яго вачах не існуе. Таму ён годны, шчодры і шчаслівы нават калі голы і галодны...» Рэаліст і постімпрэсіяніст адначасова Яўген Красоўскі шмат што сказаў і за самога Віктара Карамазава. Сказаў на будучыню, у імя сапраўднасці мастацтва. У імя праўды адлюстравання жыцця, пра што б ні гаварыў сваімі творамі пісьменнік.

Сяргей ЗАЛАМАЙ.

МАЛЯВАННЕ — БОЖАЯ МІЛАСЭРНАСЦЬ

Сёлета касцёлу ў былым мястэчку Відзы на Браслаўшчыне спаўняецца роўна 100 гадоў. Цяпер поўным ходам ідзе падрыхтоўка храма ў гонар Нараджэння Божай Маці да святкавання, якое адбудзецца ў верасні. З гэтай нагоды мастачка з вёскі Дворышча Браслаўскага раёна Аліна Трукан малюе дзве вялікія іконы для алтарнай часткі самага высокага ў Беларусі храма — «Ян Павел II» і «Езус, давяраю Табе». Палотны маюць памеры 4х2,5 метра і, на думку творцы, стануць найбольшымі ў хрысціянскіх святынях на тэрыторыі нашай краіны.

— Працу над гэтымі незвычайнымі абразамі пачала яшчэ ў сакавіку, — распавядае Аліна Трукан. — Цяпер у стадыі завяршэння ўжо партрэт Яна Паўла II. Вялікія палотны мне даводзіцца маляваць упершыню, таму для зручнасці выкарыстоўваю нават будаўнічыя рыштаванні.

На Браслаўшчыне творчасць мастачкі Аліны Трукан добра вядомая: яе запрашалі маляваць абразы не толькі для каталіцкіх святыняў, але і для праваслаўных храмаў і старавераскіх малельняў. Аліна скончыла Рэспубліканскую школу-інтэрнат імя Ахрэмчыка ў Мінску, выгадавала трох сыноў, захапляецца развядзенным квецістам. З яе дапамогаю на тэрыторыі ў відзаўскага касцёла створаны прыгожыя сакральныя куточкі, у якіх галоўнае месца займаюць мармуровыя камяні з высечанымі на іх словамі святых паслannяў. А каб стварыць велічныя палотны для алтара, Аліне даводзіцца штодня ездзіць са сваёй вёскі ажно за 30 кіламетраў. Кожны раз, нібы ўпершыню, яна з хваляваннем бярэцца за пэндзаль.

— Жыву з удзячнасцю за Божую міласэрнасць, якая дадзена мне для гэтай працы, — кажа мастачка.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Браслаўскі раён.

■ Кінакрокі

Што патрэбна мужчынам,

раскажа нам фільм пра вясновае свята, які выходзіць у пракат увосень

Кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла рамантычную камедыю сумеснай вытворчасці з расійскай кампаніяй «Маскіт» «З 8 Сакавіка, мужчыны!» рэжысёра Арцёма Аксёненкі. Карціна ўжо была паказана ў кінатэатрах Расіі, па некаторых нестыкоўках дэ-юрэ і дэ-факта ў беларускі пракат фільм плануюць выдаць толькі восенню. З надзеяй на тое, што вясновае свята актуальнае заўсёды.

Фільм, трэба сказаць, для «Беларусьфільма» незвычайны: відавочна камерцыйны, выключна забаўляльны, яскравы, «гламурны» — можа, таму і непераканаўчы, нязначны ў мастацкім плане.

Беларуская кінастудыя для стварэння стужкі прадаставіла рабочыя пляцоўкі (напрыклад, шведскі замак здымаўся на тэрыторыі Мірскага), здымачную групу для работы на тэрыторыі нашай краіны. Акрамя таго, у акцёрскім складзе таксама прысутнічаюць беларусы. Адну з галоўных роляў разам з Марыяй Бярсеневай, вядомай па серыяле «Маргоша», выканаў беларус Канстанцін Лавыш, які зараз жыве і працуе ў Амерыцы.

Галоўная гераіня Ганна Беркутава — віцэ-прэзідэнт расійскай фармакалагічнай інвестыцыйнай кампаніі ў навуковым цэнтры Сколкава, дзе вядуцца распрацоўкі незвычайнага прэпарата «Інфантылін», здольнага пазбавіць ад дэпрэсіі ўсё чалавецтва. Учора яна — паспяховая прыгожая жанчына, нявеста члена каралеўскай сям'і Швецыі. А сёння, у дзень жанчын і дзень нараджэння Ганны, жаніх крадзе формулу лекаў, разрывае змовіны і пакідае яе і дырэктара кампаніі пад следствам.

На Ганну падае падазрэнне ў тым, што яна змовілася са сваім жаніхом і прадала прэпарат шведскай кампаніі, яна ж вырашае, што формулу прадаў галоўны навуковец — Канстанцін Арлоў.

Надыхаўшыся выпарэннямі хімічных вадкасцяў, у свой дзень нараджэння Ганна атрымлівае магчымасць чытаць думкі мужчын. Ад гэтага моманту пачынаецца авантура па навуковай працы над прэпаратам (бо швед скраў сырую негатовую формулу, ха-ха) і рамантычная лінія паміж галоўнай гераіняй і Канстанцінам, думкі якога, мы ўжо ведаем, Ганна чытае...

Сцэнар напісаны, сюжэтастваральная канва вызначана, акцэнты расстаўлены. Скажам, глядач свядома ідзе на лёгкую камедыю, прабавіць вечар. Ён ведае пра некаторыя неверагодныя рэчы ў сцэнары і чакае іх увасаблення. Ёсць, аднак, нешта раздражняльна-непераканаўчае ў абыгрыванні эпізодаў. Найгранасць, безгрунтоўнасць, манернасць. Адчуваецца падман, які не дазваляе акунуцца ў казку, падрыхтаваную аўтарамі карціны.

На гэтых ненатуральных эпізодах глядач адразу ўспомніць, што ён у кінатэатры глядзіць фільм, і пяройдзе, не дай Бог, ад прыкрых дыялогаў да думак аб меню на вячэру або планах на выхадныя.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што для развіцця сюжэту мае вялікі патэнцыял наяўнасць у галоўнай гераіні фантастычнай здольнасці. На шчасце, сцэнарыст не злоўжывае гэтым і разгрупоўвае сваю ўвагу на шматлікія змястоўныя моманты. У полі зроку аказваюцца іншыя персанажы, іншыя сюжэтныя лініі, іншыя дробязі. Чытанне думак служыць толькі завязкай фільма і раўнапраўнай ніткай у канве.

Фільм «З 8 Сакавіка, мужчыны!» — з тых, у якіх нельга асобна адзначыць работу сцэнарыста, рэжысёра ці акцёрскую ігру. Ніводны са складнікаў работы не выбіваецца з агульнай масы. Усё роўна, узгоднена, і... банальна. Хіба што варта згадаць працу з музычным суправаджэннем, якое можа кардынальна змяніць успрыманне фільма. З дапамогай саўндтрэкаў фільм перадае дынаміку, узбуджэнне і хваляванне.

Агульная фабула фільма часам парушаецца недарэчнымі момантамі. Цалкам бессэнсоўным здаўся кароткі эпізод з напаўголенай Марыяй Бярсеневай у сваёй гардэробнай. Ці то аўтары хацелі дагадзіць мужчынскай частцы гледачоў, гэта значыць мелі самы практычны разлік, ці то жаночай прыгажосцю палюбавацца — усё роўна ён лішні.

Несур'ёзныя сур'ёзнасці, даведзеныя да ўзроўню фарсу, кпіны — абавязковыя элементы камедыі для пустога баўлення часу.

Фільм да таго ж пашлаваты. Большасць прачытаных Ганнай думак зводзілася да адной неад'емнай тэмы — сексуальных адносін. Мужчына ў машыне, што праязджае, вырашае падарыць сваёй жонцы на 8 Сакавіка — што ж? — сябе, гэта значыць, ноч з сабой. Адзін з правяраючых на дарозе ў думках ацэньвае памер грудзей Ганны, іншы параўноўвае яе формы з формамі сваёй жонкі. У другіх і зусім прама гучаць юрлівыя жаданні. Ну што ж рабіць, напэўна, калі мужчыны і праўда пра гэта думаюць? Толькі сцэнарыст — жанчына. Чые думкі яна чытала, каб змясціць у фільме столькі непрыхаваных пошласці? Зрэшты, ці можа наогул тэма сексу гучаць у падобнай карціне тонка і з густам?

У выніку, вядома ж, упартасць у працы і каханне перамогуць, жыццё ва ўсіх персанажаў наладзіцца, «Інфантылін» знойдзе сабе прымяненне, з'явяцца дзеці, смех і святы. Пра гэта можна не казаць — гледачы ведаюць канец з першых хвілін фільма.

Гэты яркі, дарагі фільм для «Беларусьфільма» — новы вопыт. Іншая якасць здымкі, акцэнты і жанр, якія рэдка выкарыстоўваюцца на кінастудыі, папулярныя ў шырокай аўдыторыі медыйныя акцёры, нацэленасць на забаву публікі і прыбытак. А атрыманне прыбытку актуальна заўсёды. Відаць, і тут прыйшоў час дарагіх «танных» камедый.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

■ Трэба бачыць

КІНО ПАД КУБАЧАК ГЛІНТВЕЙНА

Унікальны фестываль нямога кіно пад адкрытым небам праходзіць у Мінску і іншых гарадах краіны

У Беларусі пачаўся фестываль нямога кіно і жывой музыкі «Кінемо». Фільмы эпохі нямога кінематографа паказваюцца ў суправаджэнні жывой музыкі, напісанай спецыяльна для кожнай з карцін. Сеансы праходзяць пад адкрытым небам у дворыку мемарыяльнага музея імя Заіра Азгура. Сюды можна прыйсці з посцілкай і тэрмасам, а можна сесці на лавачку, купіць гарачую каву або глінтвейн і, як толькі познія прыцемкі дазволяць праецыраваць стужку на экран, атрымаць асалоду ад класікі кіно.

«Кінемо» праходзіць у Беларусі другі раз і абяцае набыць рэгулярны характар. Сёлета паказы праводзяцца не толькі ў Мінску: на выхадныя фестываль пераязджае ў Гродна, Магілёў і Брэст — гарады, дзе ўдалося знайсці прыдатныя пляцоўкі.

Праект Cinemascope і Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў сталі арганізатарамі фестывалю, у Мінску ім дапамагае музей імя Заіра Азгура. Адзін з арганізатараў, праграмны дырэктар праекта Cinemascope Вольга Надольская распавядае, як «Кінемо» нараджалася:

— Мы на працягу некалькіх гадоў рэгулярна арганізоўвалі рэтраспектывы фільмаў нямецкага экспрэсіянізму ў кінатэатрах Мінска, запрашаючы беларускіх музыкаў паспрабаваць свае сілы ў стварэнні саўндтрэкаў да нямога кіно. У нейкі момант аднаму з пастаянных удзельнікаў гэтых паказаў кампазітару Віталю Эпаву прыйшла ў галаву ідэя зладзіць сеанс на свежым паветры. Віталь жа прапанаваў пляцоўку для гэтага — унутраны двор музея Азгура. Дырэктар музея Аксана Багданава паставілася да ідэі з вялікім энтузіязмам — так і з'явіўся «Кінемо».

Музыкі на паказах фестывалю аднаўляюць атмасферу, якая панавала ў кінатэатрах першай трэці XX стагоддзя, калі карцінка на экране суправаджалася жывой музыкай. Тапёр або кіналюстратар — так называецца музыкант, які іграе для кінасеансаў. Са з'яўленнем гукавога кіно мастацтва тапёраў аказалася непатрэбным, аднак сёння кінаманы, у тым ліку і ў Беларусі, нярэдка звяртаюцца да падобнай практыкі. У «Кінемо» задзейнічаны музыканты з Асацыяцыі маладых кампазітараў Беларусі, якія ўзяліся напісаць музыку для кожнага фільма праграмы. Пра работу над саундтрэкамі я спыталася ў Віталя Эпава, аўтара ідэі і кампазітара:

Праект Cinemascope і Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў сталі арганізатарамі фестывалю, у Мінску ім дапамагае музей імя Заіра Азгура.

— Адным з крытэрыяў адбору музыкаў для фестывалю з'яўляецца здольнасць асэнсаваць фільм і напісаць музычны твор. Гэта ўжо не зусім тапёрскае мастацтва. Перад музыкам стаіць пэўная задача: даць фільму яшчэ адно жыццё. Чым больш нестандартна думае аўтар, тым ярчэйшыя вобразы. Падыход у кожнага з кампазітараў розны: я, напрыклад, люблю дакладнасць пераходаў паміж эпізодамі, час у нотах распісваю аж да секунд. Нехта любіць больш імправізаваць або хуліганіць — гэта не менш цікава. Мы пастаянна шукаем музыкаў для праекта і ў наступным годзе спадзяёмся ўбачыць удзельнікаў з іншых краін.

Што ж фэст падрыхтаваў гледачам? Эпоха нямога кінематографа багатая на вялікія імёны, выдатныя фільмы, этапныя эксперыменты. Вольга Надольская, працягваючы гутарку, расказала пра складанне зместу:

— Першапачаткова мы спрабавалі задаць тэматычныя рамкі, падвесці праграму пад нейкую канцэпцыю, але ў выніку адмовіліся ад гэтага. Сілаю не будзеш мілаю: калі музыкам па нейкіх прычынах не падабаецца фільм, не супадае настрой, рытм ці яшчэ нешта, лепш падабраць іншую карціну. Адзіны крытэрый, які мы стараемся выконваць пры складанні праграмы, — гэта разнастайнасць. Па-першае, жанравая: у праграме абавязкова прысутнічаюць камедыі, драмы і авангардныя кіно. Па-другое, геаграфічная: цяпер мы не абмяжоўваемся адным толькі нямецкім экспрэсіянізмам, паказваем амерыканскае, савецкае і нават японскае нямое кіно.

Адным з крытэрыяў адбору музыкаў для фестывалю з'яўляецца здольнасць асэнсаваць фільм і стварыць музычны твор. Гэта ўжо не зусім тапёрскае мастацтва. Перад музыкам стаіць пэўная задача: даць фільму яшчэ адно жыццё.

Сапраўды, у праграме «Кінемо» кожны знойдзе для сябе фільм на свой густ, у той жа час гэта карціны не выпадковыя для развіцця кінематографа. У афішы можна знайсці Гаральда Лойда (камедыя з якім адкрывала фестываль) і Бастара Кітана (яго дваццаціхвілінны фільм «Асаблівы знак» пакажуць у апошні дзень фестывалю, 17 ліпеня) — разам з Чарльзам Чаплінам найпапулярнейшых комікаў амерыканскага, а можна сказаць, і сусветнага нямога кінематографа.

Рускае кіно прадстаўлена на фестывалі дзвюма карцінамі. Наватарскі для свайго часу фільм Сяргея Эйзенштэйна «Стачка» — гэта першы поўнаметражны фільм аўтара; гледачу стужка яскрава дэманструе савецкае агітацыйнае кіно, але цікава і іншае. Эйзенштэйн распрацоўваў тэорыю, новыя кінематаграфічныя прыёмы, магчымасці, тэхнікі кіно. У першую чаргу гэта тычылася мантажу, з дапамогай якога рэжысёр спрабаваў перадаць нейкі пасыл. Таму варта паглядзець карціну на вялікім экране і ўлавіць гэты пасыл, звяртаючы ўвагу на паслядоўнасць кадраў. Другім савецкім фільмам будзе «Шахматная гарачка» Усевалада Пудаўкіна і Мікалая Шпікоўскага. У адрозненне ад сур'ёзнага тону «Стачкі», гэты фільм камедыйны.

Нельга абысці бокам і нямецкі экспрэсіянізм, такі папулярны і ўплывовы ў перыяд свайго развіцця (і пасля) — у першай палове 1920-х гадоў. Поўнаметражны фільм аднаго з яго найбуйнейшых прадстаўнікоў, Фрыца Ланга («Стомленая смерць»), прымусіць гледача паглыбіцца ў філасофскае, змрочнае, але жыццесцвярджальнае апавяданне.

У праграме абавязкова прысутнічаюць камедыі, драмы і авангардныя кіно.

Два фільмы французскіх рэжысёраў таксама варта адзначыць: «Заваёву полюса» Жоржа Мельеса і «Чарльстом» Жана Рэнуара. Мельес — самы што ні на ёсць піянер кіно, свой першы фільм ён зняў ужо ў 1896 годзе (нагадаю, датай нараджэння кінематографа лічыцца 28 снежня 1895 года). Вядомы аматар павільённых здымак стаў пачынальнікам відовішчнага кіно, жанраў феерыі, камедыі, сцэнак з трукамі, стварыў першыя навукова-фантастычныя фільмы. Жан Рэнуар, сын мастака Клода Рэнуара, вядомы сваімі эстэтычнымі, змястоўнымі фільмамі «Правілы гульні», «Вялікая ілюзія», Рэнуар паспеў зняць і шмат кароткаметражных стужак, сярод якіх і «Чарльстан». Трэба звярнуць увагу на кадры, змест, сэнс, увогуле на ўсё і паспрабаваць зразумець, у чым геній Рэнуара.

Праграма з выдатных фільмаў, аўтарскае музычнае суправаджэнне, вечаровыя прыцемкі — гэта «Кінемо». Варта скарыстацца магчымасцю і ўбачыць гэтыя фільмы на вялікім экране, паглыбіцца ў высокае мастацтва, пабываць на кінасеансе пачатку XX стагоддзя.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
29 июля 2014 г. проводит открытый аукцион № 14-А-14 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 5 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	Национальный аэропорт «Минск»	500000000004005217	2,2040	бизнес-центр с гостиницей и подземным паркингом / земельный участок для размещения объектов иного назначения	78 803 380	12 000 000	37 142 929	Обязательства землепользователя по регистрации имущественных прав на земельный участок, по проектированию и освоению земельного участка
2	ул. Каменногорская (№11 по генплану)	500000000006007186	0,6500	объект бытового обслуживания / земельный участок для размещения объектов иного назначения	1 190 237 430	179 000 000	21 938 367	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 372 855 835 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и упущенной выгоды УП «Агрокомбинат «Ждановичи» в размере 6 868 017 руб
3	ул. Бабушкина (промузел Колядичи)	500000000004005113	2,3860	производственный объект / земельный участок для размещения объектов иного назначения	1 962 901 380	294 000 000	26 334 948	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 797 134 053 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения
4	ул. Бабушкина (промузел Колядичи)	500000000004005112	4,6322	производственный объект / земельный участок для размещения объектов иного назначения	3 810 791 850	572 000 000	35 436 039	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 1 147 947 687 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения
5	ул. Рафиева	500000000005006651	0,9300	зрелищно-познавательный объект / земельный участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения	1 609 384 520	241 000 000	18 161 381	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 80 975 363 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 29 июля 2014 г. в 11^{00} по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 23 июля 2014 г. в вышеуказанном (графа 7 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иные неполученные доходы – при их наличии).

Погашение Облигаций осуществляется Банком в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, который формируется депозитарием Банка по состоянию на 27.06.2019. В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Погашение осуществляется путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь причитающихся денежных средств на счета владельцев Облигаций.

В соответствии с законодательством владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод погашаемых Облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

21. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения

В период обращения Облигаций Банк осуществляет приобретение (выкуп) Облигаций до даты начала их погашения на биржевом рынке в соответствии с правилами Биржи.

Выкуп осуществляется по цене, равной номинальной стоимости Облигации, в следующие даты: 01.07.2015, 01.07.2016, 01.07.2017, 01.07.2018. Если установленная дата выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп Облигаций осуществляется Банком по номинальной стоимости Облигации в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты по выкупленным Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В период обращения Облигаций Банк имеет право:

приобретать Облигации в иные сроки (цену и количество приобретаемых Облигаций определяет Банк), начиная с 16.07.2014;

осуществлять дальнейшую реализацию или досрочное погашение выкупленных Облигаций;

совершать иные действия с Облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

22. Порядок обращения облигаций

Обращение Облигаций осуществляется в торговой системе Биржи среди юридических лиц, резидентов и нерезидентов Республики Беларусь, в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

Сделки с Облигациями на вторичном рынке прекращаются за 4 рабочих дня до даты начала погашения Облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документа.

Первый заместитель Председателя Правления Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» **Г.С.Господарик**

Главный бухгалтер Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» **И.П.Лысоковская**

Директор Унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» **В.С.Санкович**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

КОШКА І ВОДПУСК

Надыходзіць доўгачаканы водпуск. Хтосьці паедзе на мора, хтосьці выбера адпачынак у Беларусі, хтосьці захоча паглядзець свет, а хтосьці атабарыцца на дачы. Так або інакш, многім шчаслівым уладальнікам пушыстых мурлыкаў давядзецца задумацца над тым, дзе, з кім і як пакінуць свайго хатняга гадаванца, каб запланаваны адпачынак не ператварыў яго жыццё ў суцэльныя пакуты.

Цудоўна, калі нехта з членаў сям'і застаецца дома. У процілеглым выпадку неабходна загадзя падумаць пра камфорт кошкі і выбраць для яе самы аптымальны варыянт: знайсці ёй «прыходзячую няньку», часова перасяліць яе да знаёмых, згодных узяць на сябе адказнасць за гадаванца, альбо паехаць падарожнічаць разам. Выбар за вамі, бо толькі ўладальнік лепш за ўсё ведае сваю кошку, яе страхі і перавагі.

КОШКА-ПАДАРОЖНІЦА

Замест таго, каб шукаць знаёмых, гатовых прытуліць хатняга ўлюбёнца альбо быць «прыходзячай нянькай», хвалявацца аб дабрабыце гадаванца і маляваць ва ўяўленні карціны, у якіх ваша кошка галодная, сумная і адзінокая, можна разгледзець такі варыянт, як сумесная паездка на адпачынак. Цяпер усё больш людзей адважваюцца на гэты крок, і многія прызнаюць, што кошка ў такой сітуацыі не становіцца перашкодай. Трэба толькі загадзя добра прадумаць паездку.

Таму, калі вы не можаце расстацца са сваёй улюбёнкай і будзеце значна камфортней сябе адчуваць, ведаючы, што кошка побач і з ёй усё добра, індывідуальныя асаблівасці яе дазваляюць, а краіна, у якую вы накіроўваецеся, не ставіць жорсткіх умоў па ўвозе свойскіх жывёл, то чаму б і не паставіць свой уласны эксперымент?

Вядома, у першую чаргу варта ўлічваць месца адпачынку і тэмперамент жывёліны. Дарэчы, лепш за ўсё прывучаць кошак да вандровак з ранняга дзяцінства, тады яны будуць спакойна пераносіць дарогу, хутчэй прыстасоўвацца да новых часовых апартаментаў і не будуць адчуваць страх перад чужымі людзьмі.

У шэрагу гасцініц і пансіянатаў дазволена засяленне са свойскімі жывёлами. Таму загадзя звяжыцеся з месцам вашага знаходжання і ўдакладніце магчымасць размяшчэння кошкі ў нумары.

Асаблівую ўвагу варта надаць захаванню ветэрынарных правіл, тым больш калі плануецца замежная паездка. Загадзя ўдакладніце ў ветэрынарнай клініцы асаблівасці ўвозу свойскіх жывёл на тэрыторыю канкрэтнай замежнай дзяржавы. Да моманту падарожжа ў кошкі павінен быць аформлены міжнародны ветэрынарны пашпарт з адзнакамі аб зробленых актуальных вакцынацыях, сярод якіх у абавязковым парадку павінна прысутнічаць прышчэпка ад шаленства.

Тым, хто адважыцца выязджаць са сваёй кошкай у Расію, неабходна будзе ўзяць у дзяржаўнай ветэрынарнай лячэбніцы ветэрынарны сертыфікат Мытнага саюза формы № 1.

У ЕС патрабаванні да перамяшчэння свойскіх жывёл на тэрыторыі асобных краін могуць адрозніваццца, аднак у любым выпадку абавязковай умовай будзе чыпаванне. Правесці гэтую працэдуру можна як у дзяржаўных, так і ў прыватных клініках. У шэрагу краін ЕС, напрыклад, у Вялікабрытаніі, патрабуюць праводзіць даследаванне жывёл на цітр антыцелаў да шаленства.

Акрамя таго, варта загадзя паклапаціцца аб набыцці білета для хатняга гадаванца.

Калі вы ляціце на самалёце, варта звязацца з авіякампаніяй для ўдакладнення асаблівасцяў правозу на борце свойскіх жывёл, у прыватнасці, даведацца пра дапушчальны памер кацінай пераноскі і вагі гадаванца. Месца ў салоне трэба забраніраваць загадзя, бо некаторыя авіякампаніі не дазваляюць правозіць на борце некалькі жывёл, і калі білет выкупіць іншы пасажыр, вы ўжо не зможаце прайсці ў салон са сваёй улюбёнкай.

Што ж да паездак на чыгуначным транспарце ў Беларусі, то ў цягніках з нумаранымі месцамі дазволена перавозка дробных свойскіх жывёл і птушак ва ўсіх вагонах (акрамя спальных вагонаў і вагонаў павышанай камфортнасці) пры наяўнасці ветэрынарнага пасведчання або ветэрынарнай даведкі і з адпаведнай аплатай. Пры гэтым дробныя свойскія жывёлы павінны быць змешчаны ў скрыні, кошыкі, клеткі, кантэйнеры або сумкі з воданепранікальным адсарбуючым дном.

З сабой у дарогу трэба ўзяць усё неабходнае: сухі корм, ваду, міскі, латок і напаўняльнік. Таксама, у залежнасці ад віду транспарту і памеру кошкі варта падабраць зручную для вас і гадаванца пераноску.

КОШКА — НА ГАСПАДАРЦЫ

Вядома, далёка не ўсе адважацца падарожнічаць з кошкай, ды і ў шэрагу выпадкаў гэта будзе проста немагчыма. У такім разе лепш за ўсё будзе пакінуць кошку ў родных сценах. Яна лягчэй перанясе адзіноту ў сваім доме, чым прывыканне да чужога. Для многіх гадаванцаў будзе лепш, калі яны будуць у адзіноце, але на сваёй тэрыторыі, чым у кампаніі чужых людзей і ў незнаёмым доме. Пераезд у новае месца для кошкі заўсёды з'яўляецца стрэсам. Яго ад адсутнасці любімага гаспадара для кошкі дастаткова, дадаваць сюды яшчэ хваляванне ад пераезду наўрад ці неабходна.

Папрасіце адказных знаёмых альбо суседзяў дапамагчы вам. Вядома, ідэальны варыянт (але яго часта нялёгка рэалізаваць), калі хтосьці пагодзіцца пажыць у вас дома разам з кошкай. Таму як найбольш прымальнае выйсце з сітуацыі можна разглядаць «прыходзячую няньку». Трэба, каб памагаты заходзіў два разы на дзень або хаця б раз на дзень, каб памяняць ваду, пакарміць, прыбраць латкі, праветрыць памяшканне, пакантактаваць з кошкай, пагладзіць, пагуляць.

Да ад'езду трэба скласці падрабязныя пісьмовыя інструкцыі, дзе ў абавязковым парадку пазначыць тэлефоны ветэрынараў і бліжэйшых ветэрынарных клінік, схему кармлення і штодзённыя абавязкі «нянькі».

Расстаўце некалькі вялікіх місак з вадой у розных канцах кватэры. Гэта робіцца на выпадак, калі кошка перакуліць адну, — у такім разе ў яе заўсёды будзе доступ да вады.

Калі кошка харчуецца сухім кормам, насыпце яго з запасам, на выпадак, калі «нянька» прапусціць кармленне.

Расстаўце па кватэры некалькі латкоў. Пакіньце з запасам корм, напаўняльнік, аптэчку. Вядома, не забудзьцеся пакласці на ўсялякі выпадак грошы.

Перад ад'ездам абавязкова старанна прыбярыце кватэру, схавайце небяспечныя прадметы, у тым ліку ачышчальныя сродкі, зачыніце ўсе вокны. Не пакідайце ніякіх рэшткаў вашых збораў у дарогу — поліэтыленавых пакетаў, вяровак і інш.

ЧАСОВЫ ПЕРАЕЗД

Яшчэ адзін варыянт вырашэння праблемы — часова пасяліць саму кошку ў сяброў, знаёмых альбо сваякоў. Рабіць гэта варта, калі не атрымалася знайсці чалавека, гатовага заходзіць да вас, карміць і даглядаць вашу ўлюбёнку.

Пры гэтым трэба ўлічваць, ці былі ў бока, які прымае, калі-небудзь кошкі. Дом з кошкай і без — вялізная розніца, якая часта загадзя не ацэньваецца. Могуць узнікнуць праблемы з лекамі, якія звычайна валяюцца, кухонным вядром, адчыненымі вокнамі і іншымі небяспечнымі для жывёлы прадметамі. Таму неабходна правесці падрабязны інструктаж з часовымі ўладальнікамі гадаванца.

Лепш за ўсё перавезці кошку ў новае жыллё за пару дзён да ўласнага ад'езду — у выпадку ўзнікнення якіх-небудзь пытанняў на іх можна будзе адказаць, а патэнцыйныя праблемы вырашыць на месцы. У першы дзень перасялення лепш за ўсё як мінімум некалькі гадзін правесці ў новым доме разам з гадаванцам, каб ён адчуваў сябе больш спакойна. З сабой, акрамя жыццёва неабходных рэчаў (корм, латок, напаўняльнік), абавязкова вазьміце цацкі, любімую ляжанку альбо плед. Кошцы будзе спакайней у новым доме са звычайнымі для яе пахамі.

ГАСЦІНІЦА ДЛЯ КОШКІ

Сёння пачалі з'яўляцца гасцініцы для свойскіх жывёл. Таму ў выпадку адсутнасці знаёмых альбо пры неабходнасці тэрміновай паездкі можна скарыстацца іх паслугамі.

У гасцініцы абяцаюць індывідуальнае кармленне, догляд, ветэрынарны кантроль за станам здароўя. Перад тым, як пакінуць свой «скарб» у «гатэлі», абавязкова прыслухайцеся да рэкамендацый знаёмых, пачытайце водгукі і паглядзіце на ўмовы ўтрымання там гадаванцаў.

Ірына КАСЦЮЧЭНКА, фелінолаг

■ Выдавецкі дом «Звязда» прэзентуе

Станьце бліжэй да роднай прыроды!

Часопіс «Родная прырода» — шыкоўнае ілюстраванае выданне з мноствам цікавых фотаздымкаў жывёльнага і раслінnага свету, непаўторных беларускіх пейзажаў, з займальнай і карыснай інфармацыяй аб навакольным асяроддзі, аб братах нашых меншых.

«Родная прырода» — чытайце і любуйцеся!

	1 мес.	3 мес.	6 мес.
74926 — для індывідуальных падпісчыкаў	39 600	118 800	237 600
749262 — для ведамасных падпісчыкаў	48 000	144 000	288 000

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЕДЗЕМ НА ПІКНІК

Кнышы

Спатрэбіцца: *крупы грэцкія — 2/3 шклянкі, бульба — 500 г, цыбуля рэпчатая — 300 г, грыбы — 200 г, алей, соль, цукар, часнок (2–3 зубкі), яйка курынае (для змазвання) — 1 шт., воцат яблычны (у цеста) — 2 ч.л., смятана, зяленіва, мука — 2 шклянкі, кмен — 1 ч.л.*

Для начынкі адварваем бульбу ў падсоленай вадзе. Зліваем адвар і ставім яго астуджацца.

У каструльцы з тоўстым дном абсмажваем грэцкія крупы з 1 ч.л. алею да смачнага водару. Даліваем 1,5 шклянкі вады, дадаем соль і 1 ч. л. цукру і варым да поўнага ўбірання вадкасці. Для цеста муку ўсыпаем у міску, дабаўляем 3 ст. л. алею, кмен. Бярэм 2/3 шклянкі адвару ад бульбы, разводзім у ім 1 ч. л. цукру, соль і воцат. Выліваем сумесь у муку і замешваем цеста, дадаючы, калі трэба, муку. Гатовае цеста не павінна ліпнуць да рук і мусіць добра цягнуцца. Загортваем яго ў плёнку і пакідаем на паўгадзіны.

Цыбулю і грыбы рэжам і смажым на алеі з дабаўленнем солі, 1 ч. л. цукру і часнаку. Таўчэм бульбу, дадаем да яе цыбулю з грыбамі і грэчку. Начынку добра вымешваем і ставім астуджацца.

Цеста дзелім на 2 часткі. 1-ю частку раскочваем-расцягваем вельмі тонка на паперы для выпечкі (паперу пасыпаць мукой). Чым танчэй, тым лепш. Злёгку мажам раскочанае цеста алеем. Выкладваем на цеста палову начынкі доўгім валікам, прыкладна ў 5 сантыметрах ад доўгага краю і ў 2 см ад кароткага. З дапамогай паперы загортваем больш кароткі край цеста на начынку. Нацягваем-расцягваем цеста кончыкамі пальцаў, укручваючы начынку. Потым паперай загортваем больш доўгі край цеста. Таксама падцягнуўшы-нацягнуўшы яго край на начынку. Кончыкі зашчыпваем-заклейваем. Паперай фарміруем з рулета каўбаску. Дзелім нашу нарыхтоўку спачатку напалам, потым яшчэ кожную частку напалам. Атрымаецца 4 часткі. Лепш за ўсё дзяліць драўлянай лапаткай. Цяпер у кожнай атрыманай частцы добра зашчыпваем адкрытыя канцы. Кожную частку падзелім лапаткай яшчэ на 2 часткі. Усяго 8 кнышыкаў. Ставім кныш на стол адкрытай часткай угору і, крыху прыпляскваючы, робім невялікае паглыбленне ў сярэдзіне з начынкай, як бы загінаючы цеста да цэнтра, але пакідаючы незакрыты ўчастак. Падобны такія кнышыкі на беляшы. У ямку з начынкай кладзем трохі сечанай зялёнай цыбулі з кропам і кававую лыжачку смятаны. Перакладваем на бляху, засланую пергаментам, мажам узбоўтаным яйкам. І запякаем у духоўцы пры 190–200 градусах прыкладна 30 хвілін. З другой часткай цеста і начынкі робім гэтак жа. Складваем гатовыя кнышыкі ў міску і захутваем ручніком хоць бы хвілін на 15.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Рэстаўруем старое люстэрка

Спатрэбіцца: *люстэрка ў драўлянай рамцы, спрэй для чысткі духоўкі, клей ПВА, тканіна, нажніцы, сухая анучка, каляная губка для мыцця посуду і пэндзлік.*

Вымаем люстэрка з рамкі і кладзем на газеты. Працуем асцярожна, каб не парэзацца.

Бярэм упадабаную тканіну з кветкавым малюнкам. Выразаем яе па памеры рамкі, не забываючы аб прыпуску. Рамку шчодра пакрываем клеем. Прыклейваем тканіну да рамкі. Дапамагаем у працы палачкай або спіцай, калі рамка рэльефная. Загінаем тканіну за рамку і замацоўваем.

Сродак для чысткі духоўкі распыляем па краях люстэрка. Асцярожна счышчаем пасераброўнае люстэрка калянай губкай. Чысцім сухой анучкай. Вось так павінна выглядаць наша вычышчанае люстэрка. Прыкладваем да люстэрка тканіну з яго зваротнага боку. Для надзейнасці можна пакласці на тканіну ліст кардону або тонкай фанеры. Устаўляем люстэрка ў рамку.

Даты Падзеі Людзі

1906 год — нарадзіўся Васіль Самуцін, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, журналіст. Заслужаны дзеяч культуры. З 1942 года рэдактар падпольнай газеты «Віцебскі рабочы», з 1944-га — газет «Звязда» і «Савецкая Беларусь». З 1950 года намеснік міністра лясной гаспадаркі БССР. У 1953–1966 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі».

1919 год — падпісаны Версальскі мірны дагавор з Германіяй, які завяршыў Першую сусветную вайну 1914–1918 гг.

1979 год — пастановай Савета Міністраў Беларусі была заснавана Чырвоная кніга Беларусі, афіцыйнае выданне, якое змяшчае анатаваны спіс рэдкіх (і тых, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення), на тэрыторыі Беларусі дзікіх жывёл і дзікарослых раслін. Першае выданне выйшла ў 1981 г., у яго ўключана 80 відаў ахоўных жывёл і 85 відаў раслін. Спіс другога выдання (1993) змяшчае 182 віды жывёл, 180 відаў сасудзістых раслін, 17 відаў грыбоў і 17 відаў лішайнікаў. 3-е выданне — «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь» — выйшла ў 2-х тт.: «Жывёлы» (2004, 189 відаў) і «Расліны» (2005, 200 відаў сасудзістых раслін, 21 від водарасцяў, 29 відаў грыбоў, 24 віды лішайнікаў). Змяшчае звесткі аб стане кожнага занесенага ў яе віду, характары і ступені пагрозы яго існаванню. Падстава для ўключэння віду ў Чырвоную кнігу — звесткі аб памяншэнні яго колькасці, арэала і ўмоў існавання, якія пацвярджаюць неабходнасць прыняцця захадаў па яго ахове.

Было сказана

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:

«Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць здзіўляцца і захапляцца жыццём».

НАРОДЖАНЫЯ 28 ЧЭРВЕНЯ

Яны вельмі эмацыянальныя. Іх падыход да жыцця адрозніваецца прамалінейнасцю і імклівасцю — адносіны да блізкіх напоўнены добразычлівасцю і здаровым гумарам. Многія з іх становяцца лідарамі як у сваёй сям'і, так і ў грамадскіх структурах. Звычайна яны любяць працаваць у цішы свайго кабінета. Ім неабходна разуменне з боку грамадства і прызнанне іх талентаў. У сваім асяроддзі яны аказваюцца нязменнымі кансультантамі па пытаннях, звязаных з чалавечай натурай. У іх ёсць шанц стаць псіхолагамі, даследчыкамі чалавечых душ.

НАРОДЖАНЫЯ 29 ЧЭРВЕНЯ

Мэта іх жыцця — ператварэнне мары ў рэальнасць. Яны адначасова і адказныя выканаўцы замоўленых цудаў, і наіўныя летуценнікі, якія лунаюць у аблоках. Людзі гэтага дня — шукальнікі праўды, не прызнаюць хлусні і фальшы. Іх цяжка ўвесці ў зман, яны бачаць каштоўнасць нават у малым і не шукаюць для сябе выгады. Як правіла, гэта надзіва шумныя і рухомыя людзі, іскрыстыя весялосцю, яны непасрэдныя, абаяльныя і адкрыты, як дзеці, аднак, гэта не замінае ім паспяхова зарабляць грошы, дасягаць поспеху ў бізнесе. Думка пра тое, што яны могуць ашчаслівіць іншых, прыносіць ім найвышэйшае задавальненне.

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Верим в победу!»

Приорбанк RZB Group

Сведения об организаторе рекламной игры.
«Приорбанк» ОАО, УНП 100220190, г. Минск, ул. В.Хоружей, 31А.

Свидетельство о регистрации выдано Национальным банком Республики Беларусь 14 апреля 2005 года.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 12 от 06.05.2013 г.

Наименование рекламной игры.
«Верим в победу!».

Место (территория) проведения рекламной игры.
Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры.
с 8 мая по 1 июля 2014 г. (включая период розыгрыша и выдачи призов).

Сведения о государственной регистрации рекламной игры.
Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2354 от 03.05.2014 выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры.
В рекламной игре «Верим в победу!» приняли участие 1967 человек.

Состав и размер призового фонда включал в себя (см. таблицу):
Размер призового фонда составляет 11 061 690 (Одиннадцать миллионов шестьдесят одна тысяча шестьсот девяносто) белорусских рублей. Призовой фонд включает призы, указанные в таблице

№	Наименование приза	Стоимость приза с НДС, рублей	Количество призов, шт.	Общая стоимость с НДС, рублей
1	Комплект, в том числе:	925 133	10	9 251 330
	• кепка с логотипом	131 505	10	1 315 050
	• куртка мужская	543 425	10	5 434 250
	• рубашка поло мужская	250 203	10	2 502 030
2	Рюкзак с логотипом	128 352	10	1 283 520
3	Кружка, керамика с логотипом	52 684	10	526 840

Призовой фонд разыгран полностью. Информация о победителях находится в таблице.

ФИО	Приз
Адынец Юлия Николаевна	комплект
Апаликов Александр Геннадьевич	комплект
Воронович Алексей Николаевич	комплект
Воронович Алексей Николаевич	кружка
Денисюк Сергей Дмитриевич	комплект
Жавнерчик Алла Николаевна	кружка
Жукова Дарья Сергеевна	кружка
Заливака Геннадий Александрович	рюкзак
Заливака Геннадий Александрович	кружка
Камков Александр Геннадьевич	рюкзак
Канаш Николай Иванович	рюкзак
Канаш Николай Иванович	комплект
Колосовский Вячеслав Арнольдович	кружка
Кравцов Геннадий Семенович	комплект
Кучинская Марина Евгеньевна	рюкзак
Осипов Алексей Владимирович	рюкзак
Перенесенко Максим Александрович	комплект
Ракитский Сергей	рюкзак
Римша Денис Леонидович	рюкзак
Рудик Алиса Владимировна	комплект
Рудченко Владимир Владимирович	кружка
Святская Мария Сидоровна	рюкзак
Середа Анна Петровна	кружка
Слонимская Анна Владимировна	комплект
Талалаев Валентин Викторович	комплект
Титовец Светлана Валерьевна	рюкзак
Холодов Андрей Александрович	кружка
Холодов Андрей Александрович	рюкзак
Шишко Татьяна Сергеевна	кружка
Якимович Нина Владимировна	кружка

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры — (017) 289 90 90.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.40	21.45	17.05
Віцебск	4.21	21.43	17.22
Магілёў	4.30	21.36	17.06
Гомель	4.36	21.23	16.47
Гродна	4.57	21.59	17.02
Брэст	5.07	21.50	16.43

Месяц

Маладзік 27 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Касьяна, Лазара, Рыгора, Фёдара.*
К. *Вольгі, Раісы, Вінцэнта, Ірынея, Лявона, Паўла.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+25..+27°С	КІЕЎ	+23..+25°С
ВІЛЬНЮС	+16..+18°С	МАСКВА	+18..+20°С
РЫГА	+16..+18°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+17..+19°С

УСМІХНЕМСЯ

Рашаем з дзіцем задачу: «У першы дзень з'елі пяць шклянак трускалак, у другі дзень на дзве менш, а ў трэці столькі, колькі ў першы і другі разам. Колькі ўсяго шклянак трускалак з'елі?»

Сядзіць, рашае, бурчыць.

— Чаго бурчыш?

— Дык елі б адразу ўсе, чаго іх на тры дні расцягваць!

Нішто ў доме не захоўваецца так трапятліва, як непатрэбны хлам пад назвай «А раптам спатрэбіцца».

У Адэсе.

— Сарачка! Вы сёння проста выдатна выглядаеце!

— Ха! Гэта я яшчэ сябе дрэнна адчуваю!

carticatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.561. Індэкс 63850. Зак. № 2569.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 чэрвеня 2014 года.